Пралетарыя всіх краёў, злучайцеся!

АЎТОРАК

Савецкая Беларусь

Органа Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

10 ГОД ВЫДАННЯ.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 473. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вярочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капітэрэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капітэрэлі пасярод тэксту 1 р. — к. За радок капітэрэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвешныя на 50 проц. даражэй. Зьвы тарыфу бяруцца 10 проц. налогу.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 73 (2562) Аўторак, 2-га красавіка 1929 г.

XVIII 6518

66

Дзяржаўная публічная бібліятэка „Одеса" 24 3 30

151810а

10 ГОД ВЫДАННЯ

ПРАЦЫ УСЕСАЮЗНАГА СТАРАСТЫ.

УШАНАВАННЕ КАЛІНІНА НА АБ'ЯДНАНЫМ ПАСЯДЖЭНЬНІ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК СССР, ПРЭЗЫДЫУМУ УсеЦВК, САЮЗНАГА СНК І СНК РСФСР.

МАСКВА, 30-III. Пасяджэньне старшынствам тав. Пятроўскага адбылося аб'яднана[е] пасяджэньне прэзыдыуму ЦВК Саюзнага СНК РСФСР, УсеЦВК, Саюзнага Калініна з пасяджэньнем прэзыдыуму ЦВК і ЦВК СССР, на якім ушаноўвалася памяць Калініна, на пасадзе старшыні ЦВК і ЦВК СССР.

— Сёньня,—гаворыць тав. Пятроўскі, — споўнілася дзесяцігодзьдзе сваёй працы з Міхаілам Іванавічам. 10 год назад, калі кандыдатура Міхаіла Іванавіча высоўвалася на пасаду старшыні ЦВК, тт. Ленін заначаў, што, адпавядаючы задачам, якія стаяць перад краінай, Ленін на высокі пост старшыні ЦВК неабходна высунуць такога чалавека, які сымбалізаваў-бы аб'яднаньне клясы і сялянства і якога рабочае навіць паміж імі правільныя адносіны, забясьпечваючы Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Міхаіл Іванавіч быў пакінуты на гэты пост таму, што ён гэтыя якасьці злучаў. Першы знаходжаньня Міхаіла Іванавіча на пасадзе старшыні УсеЦВК адзначаецца грамадзянскай вайной. Рабочы клас і сялянству прыходзілася ні[на]пружваць сілы для таго, каб разьбіць контр-рэвалюцыю. Мы пабачылі, што, звязаны Міхаілу Іванавічам, пры гэтай лютай барацьбе перамогу атрымалі рабочая клясы і сялянства: у час грамадзянскай вайны Міхаіл Іванавіч аб'яднаў дадтрымліваў бадзёрасьць армейцаў і часта пад варожымі пераконваў іх у тым, што перамога можа.

Пасьля грамадзянскай вайны Савецкаму Саюзу прышлося, у лікія цяжкасьці—голад, разруху, зварочвацца за дапамогай да рабочых мас, да бядных і сярэдніцкіх пластоў сялянства. І Міхаілам Іванавічам была вялікая энэргія: ён у сяле, і тады езьдзіў па найбольш цяжкарыўных.

Сваёй працай Міхаіл Іванавіч заслужыў сваё імя ў гісторыі. Тут, у дзесяцігодзьдзе Міхаіла Іванавіча,

Вясна набліжаецца—ці падрыхтаваліся да сяўбы?

Кантрактацыя пад пагрозай зрыву.

Адным з асноўных мерапрёмстваў па падняцьцю сельскай гаспадарцы зьяўляецца кантрактацыя пасеваў. Праз кантрактацыю мы дзяржаўна робім уплыў на асноўную масу бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак у сэнсе вываленьня іх ад уплыву кулака, праз кантрактацыю мы плянава ўзмацняем саюз паміж сацыялістычным горадам і вёскай. Гэта зьяўляецца дастатковым, каб падкрэсьліць, якая ўвага павінна быць зьвернута на гэту работу ня толькі апаратам, які праводзіць кантрактацыю, але і ўсёй нашай партыйнай і савецкай грамадзкасьцю.

Пры разгледжаньні вынікаў праведзеньня кантрактацыі за мінулы год ЦК партыі адначыў, што асноўным недахопам у гэтай кампаніі ў мінулым годзе былі недастатковая арганізацыйная падрыхтоўка, позьняе разгортваньне гэтай работы на вёсцы, недастатковая папулярызацыя гэтага мерапрыёмства сярод сялянства.

Можна ўжо канстатаваць, што і ў новай кампаніі па кантрактацыі пачынаюць паўтарацца старыя памылкі. На мясцох да гэтага часу адсутнічае поўнае асазнаньне значэньня кантрактацыі, адсюль і думка паасобных нізавых работнікаў, што лепш кантрактаваць пасьля пасеву. Ня ўлічана, што вусім недастаткова закупаць засеянае, а асноўная задача дапамагчы селяніну засеяць з максымальнай карысьцю як для яго, так і для дзяржавы, а дзеля гэтага неабходна дапамагчы вытворчым крэдытам, чыстагатунковым насеньнем і дабіцца праведзеньня селянінам мінімальных агрыкультурных мерапрыёмстваў.

Мы позьнімся з праведзеньнем кантрактацыі. Да гэтага часу работа ў акругах не разгорнута, асабліва па зернавых культурах. Асабліва кепска абстаіць справа з папулярызацыяй ідэі кантрактацыі і зьвязаных з ёю мерапрыёмстваў сярод сялянства. Асноўная маса сялянства да гэтага часу ня ведае выгады кантрактацыі для сваёй гаспадаркі і ўмоў кантрактацыі.

Амаль без папярэдняй падрыхтоўкі высылаецца тэхнічны працаўнік с.-г. крэдытнага таварыства в цьвёрдым заданьнем столькі-та закантрактаваць, ня больш і ня менш, і да вызначанага тэрміну.

Адсюль атрымліваецца, што не кантрактант нават заўсёды ведае ўсе ўмовы, не гаворачы ўжо аб усёй працы ў вёсцы. А трэба, каб умовы былі вядомы ўсяму сялянству. Няхай і кулак ведае, што робіць дзяржава для падняцьця бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Ня ўлічваецца, што ад правільнай і поўнай інфармацыі сялян аб выгадах і аб умовах кантрактацыі залежыць ня толькі засеў культур, але і, галоўным чынам, своечасовая і поўная задача па кантрактацыі ўвосень. Гэтаму нас дастаткова навучыў вопыт спагнаньня па кантрактацыі ў бягучым годзе.

Неабходна ўказаць і на тое, што ў паасобных мясцох няправільна зразумелі значэньне кантрактацыі, як мэтад узмацненьня каапэраваньня бядняцка-серадняцкай гаспадаркі. Ёсьць выпадкі, калі замест растлумачальнай работы аб унясеньні паю дапускаецца мэтад утрыманьня яго з падлягчаючага выдачы авансу, што зьяўляецца зусім недапушчальным. Асабліва важна адзначыць, што да гэтага часу нашы калектыўныя гаспадаркі ня ўдягнуты ў гэту справу. Апараты, праводзячыя кантрактацыю, чамусьці лічаць, што асабліва важна ў першую чаргу правесьці кантрактацыю сярод індывідуальных гаспадарак, ня ўлічваючы, што найлепшым памоцнікам для праведзеньня гэтай работы сярод індывідуальных гаспадарак іменна павінны быць прыкладам калектыўныя гаспадаркі.

Часу для гэтай работы засталося вусім мала. Вынік гэтай кампаніі выключна залежыць ад таго, наколькі шырока мы разгарнулі гэту работу іменна на вёсцы. Калі мы будзем прадаўжаць гэту работу так, як цяпер, дык ёсьць поўная пагроза зрыву гэтай кампаніі.

Даволі абгаварваць пляны ў райённых цэнтрах. Трэба ўсю работу перанесьці на вёску.

Трэба загадзя ўлічыць, што ў бягучым годзе план кантрактацыі намечан амаль на 80 проц. больш, чым у мінулым годзе, і што адзін каапэрацыйны апарат з гэтым ня справіцца. Неабходна забясьпечыць поўнае і своечасовае падтрыманьне з боку ўсіх савецкіх і партыйных органаў.

Толькі пры гэтай умове мы выканаем намечаны план і тым самым рашэньне XV зьезду аб павялічэньні ўраджайнасьці.

Абрамсон.

БАЛОТА.

(АГРАНАМІЧНЫ ФЭЛЬЕТОН).

Па таламу сьнегу ледзь цягнуліся разламаныя сані. Каняка правальваўся ў сьнег, фыркаў і рашуча адмаўляўся пабегчы ўгрунь. Па бакох поле было пакрыта плямамі расталяўшай зямлі; упераадзе быў відзен набухшы лёд рэчкі з верхаводкаю па бакох.

Я ехаў з незнаёмцам з Нараўлянскага райёну, Мазырскай акругі. Незнаёмец быў досыць прозаічны практык, а пагэтаму зусім натуральна, што ён не прыкмячаў набліжэньня весны, не зьвяртаў увагі на так званую „вясковую ідылію". Я ведаў, што незнаёмец мае блізкае дачыненьне да агранамічнай працы, а пагэтаму з увагаю слухаў суму фактаў, выкладзеных мне.

— Гады два таму назад аграномам у Нараўлянскім райёне было добра працаваць—мелі свой аграпункт з добра наладжанымі аграгабінэтамі. Але восеньню 1928 г. аграномаў, пад пагрозай міліцыі, вынялі з памяшканьня. І да сёньнешняга дню ўвесь дапаможны матар'ял: пляката, маналіты і экспанаты аграгабінэту звалены ў груды. Машыны ўсю восень ляжалі пад адчыненым небам.

Замест каня аграномам даюць па дзевяць рублёў у месяц, з якімі можна абыйсьціся толькі пры тэй умове, калі селянін згодзіцца весьці за грыўну вёрст пятнаццаць-дваццаць. Досыць часта можна наглядаць такі малюнак: агранам пехатой ідзе ў вёску праводзіць лекцыю, а насустрач яму па пары коняй імчыцца прадстаўнік райвыканкому.

Загадчык земадзелу... Ці трэба аб ім казаць? Ён езьдзіць па вёсцы, спагняе падатак... І толькі... Ды наогул з загадчыкамі гора: за восем месяцаў зьмянілася тры загадчыкі... Гледзячы на іх, мяняюцца і справаводы. Райвыканком вялікі спэц загатаўляць дырэктывы, а дапамогі... практычнай дапамогі.. Аб сельсаветах і казаць ня трэба.

— А вось нядаўна,—тут мой незнаёмец ажывіўся,—нядаўна быў такі выпадак. Агранам Кубліцкі паехаў у Вуглоўскі сельсавет праводзіць сходы сялян па аграмінімуму. Досыць удала правёў працу. І ведаеце, як гэта ня дзіка... аграному райвыканком даў выгавар... Выгавар за тое, што не паведаміў Вуглоўскі сельсавет аб сваім прыезьдзе і без яго ведама праводзіў працу на ўзьняцьцю ўраджайнасьці. Выгавар за тое, што стары сумленны агранам ня прышоў у бюракратычны сельсавет і не падшыў сваю «камандыроўку» да паружэлай папкі аб праведзеньні пасеўнай кампаніі... Выгавар за тое... Ну хай-бы няправільна агранам зрабіў, хай-бы гэта памылка была з яго боку —«растроіў» плян сельсавету, але ня выгавар трэба даць... Па-таварыску трэба было папярэдзіць.

Пасьля доўгай паўзы незнаёмец з нэрвовасьцю працягваў:—вы думаеце, што так зьдзекуюцца над аграномаміі толькі ў Нараўлянскім райвыканкоме? У Каралінскім ня лепш. Там райагранома называюць пастухом, а памоцнікаў-практыкантаў падпаскамі. У фінчастцы лічаць, што чым агранамаў менш, тым бюджэт мацней:—агранам в возу—бюджэту лягчэй.

З ачаем і нейкім хваравітым надрывам незнаёмец скончыў:—ня дзіўна, зусім ня дзіўна, калі ў Мазыршчыне ніхто ня хоча працаваць. Сорак процантаў нехапае аграномаў. І не таму гэта, што людзі баяцца палескага каўтуна, не таму, што Мазыршчына бедная брудная. Аграномы баяцца такога бюракратычнага балота, якое душыць, цісьне настаўніка зямлі, агранома-чалавека.

Ц. З.

Будуюцца фабрыкі хлеба.

(*Ад нашага бабруйскага карэспандэнта*).

Бабруйшчына ўзяла рашучы курс на ўзмацненьне сацыялістычнага сэктара сельскай гаспадаркі, стала на шлях будаваньня буйных калгасаў.

Плян калгасаўскага будаўніцтва выкананы ужо амаль што поўнасьцю. З вызначаных да арганізацыі 70 калектыўных гаспадарак ужо арганізавана 65. Шпаркім тэмпам праца па калектывізацыі ідзе ў Рагачэўскім раёне. Да гэтага часу там арганізавана 7 калектыўных гаспадарак. Але Жлобінскі раён перавысіў усе раёны якасьцю калгасаўскага будаўніцтва, будаваньнем буйных калгасаў. Ён можа ганарыцца гэтай работай.

На яго тэрыторыі ў вёсцы Каротковічы, дзе некалькі год таму назад «абнаўляліся» іконы, дзе панавала цэмраі закасьцянелаякансэрватыўнасьць сялянства, арганізаваўся самы буйны на Бабруйшчыне, а можа і на Беларусі, калгас на надзельнай зямлі. У калгас уступіла 70 двароў, але гэтая лічба будзе яшчэ папоўнена. Заняўшы плошчу зямлі звыш тысячы гэктараў, гэты калгас будзе магутным калгасам, фабрыкай хлеба.

Гэта ня ўсе заслугі Жлобінскага раёну. Тут ёсьць яшчэ адно буйнае дасягненьне: стварэньне новага буйнага калгасу „Расьсьвет-Пераможца" шляхам зьліяньня двух калгасаў і ўцягненьня новых сяброў в вёскі Майскае.

Калгас «Пераможца» яшчэ нядаўна арганізаваўся. Ён вырас з сельска-гаспадарчага гуртка вёскі Майскае. Калгас «Расьсьвет» працягнуў яму руку, прапанаваў разам працаваць. Калгасы парашылі зьліцца. У нядзелю 31 сакавіка адбылося ўрачыстае афарміленьне зьліяньня гэтых калгасаў і прыём новых сяброў.

Новы калгас будзе аб'яднаць 97 сямей. Маемасьць і гаспадарка калгасу «Расьсьвет» зьявіцца першай базай для сваёй гаспадарчай работы. А ў далейшым гэты калгас мае вялікую будучыню: у ім будзе шырока разгорнута індустрыялізацыя, будзе пабудавана электрастанцыя, некалькі заводаў і г. д. У карыстаньні калгасу будзе больш тысячы гэктараў зямлі.

Хваля будаваньня буйных калгасаў перакінулася і ў іншыя раёны нашай акругі. Нядаўна арганізован новы калгас у вёсцы Вялікая Сьліва, Слуцкага раёну. У гэты калгас увайшло 45 сялянскіх гаспадарак. У в. Чыркавічы, Парыцкага раёну арганізаваўся калгас з 60 сялянскіх двароў.

Апошнімі днямі на сходзе сялян вёскі Таль, Любаньскага раёну, 30 сялянскіх двароў заявілі аб сваёй згодзе арганізаваць калектыўную гаспадарку.

Будаваньне буйных калгасаў у нас ідзе ня толькі за кошт арганізацыі новых калгасаў на надзельных землях, яно ідзе і за кошт удягненьня ў існуючыя калгасы новых сяброў і за кошт злучэньня некалькіх калгасаў у адзін. Яшчэ вось нядаўна калгас „Прамень Камуны" Старобінскага раёну папоўніўся за кошт суседняй вёскі Чапялі; у яго ўступіла новых 70 двароў. Зьліяньне асобных калгасаў адбылося ў некалькіх раёнах.

Характарызуючы працу па калектывізацыі па асобным раёнам, трэба сказаць, што на першым месцы стаіць Жлобінскі і Рагачэўскі раёны. У гэтай справе далёка адсталі Парыцкі, Чырвона-Слабодзкі і Слуцкі раёны, дзе арганізавана да гэтага часу па 1—2 калгасы на раён.

Наогул-жа Бабруйшчына ў справе калектывізацыі стала на правільны шлях буйнага калгаснага будаўніцтва.

А. Дамброўскі.

Кампанію самаабкладаньня трэба скончыць.

Аршаншчына сабрала 70 прац. прынятых сходамі сум.—Нядо... ў Гомельшчыне, Бабруйшчыне і Віцебшчыне.

Водлуг апошніх вестак Наркамфіну, па ўсёй БССР самаабкладаньне прынята ў суме 2298344 руб. Прычым неабходна адзначыць, што весткі аб ходзе самаабкладаньня на 25 сакавіка далі толькі Аршаншчына, Меншчына, Бабруйшчына і Гомельшчына, а рэшта округ вестак на гэты тэрмін пакуль што яшчэ не далі.

Калі справа з прыняцьцем сходамі насельніцтва самаабкладаньня стаіць больш-менш здавальняюча, дык зусім іншы малюнак са зборам прынятых насельніцтвам сум. Так, да сёнешняга дню па самаабкладаньню сабрана толькі 616,369 руб., што складае 26,8 проц. прынятых сходамі сум.

Гэта лічба гаворыць аб тым, што збор самаабкладаньня праходзіць дрэнна. Асабліва ў гэтым напрамку адстаюць Гомельская, Бабруйская і Менская акругі: у Гомелі на 25 сакавіка сабрана толькі 6,9 проц., у Бабруйскай—14,3 проц. і ў Менскай—16,5 проц. прынятых насельніцтвам сум, і гэта ў той час, калі Аршанская округа сабрала 70,3 проц.

Між тым вясеньняя сяўба не за гарамі, і сялянства будзе занята ёю, калі так можна сказаць, па горла, і цяжка будзе праводзіць збор самаабкладаньня.

У чым-жа прычыны такога слабага тэмпу ў зборы сродкаў?

Галоўная прычына—арганізацыйная бязьдзейнасьць многіх райёнаў і округ. Мясцовыя працаўнікі чакалі самацёку паступленьня; супакоіліся на пастановах агульных сходаў насельніцтва і не рабілі раскладкі прынятых сум. Той факт, што па шэрагу округ няма вестак на 25 сакавіка, па нашай думцы, сьведчыць аб тым, што гэтым округам, відаць, няма чым пахваліцца ў галіне збору самаабкладаньня.

Зразумела, што пры нядбайнасьці і сьпячцы справа самаабкладаньня рухацца наперад ня можа, бо мы добра ведаем, што там, дзе гэтай справе аддалі належную ўвагу, дзе самаабкладаньне не адносяць на задні плян, там мы маем і добрыя вынікі. Прыкладам у гэтым можа служыць Аршаншчына, якая да 25 сакавіка сабрала больш 70 проц. прынятай сходамі насельніцтва сумы.

Перад нашымі акруговымі цэнтрамі стаіць неадкладная задача—зараз-жа ўзмацніць нагляд за працай райвыканкомаў, мабілізаваць усе сілы для разгортваньня... каў, а р... да адказ... цаўнікоў... весьці пр... лена рас... дамі сум...

Трэба... часовагі... станьня... печыць... тар'яла... дам по... рыстаць... сродкі, ... станымі... кладаньн...

Трэба а... застаўся... максыма... нуліся пе... недабору... даньню. ... адбіцца н... неабходны... цовых кул... ных і гаспадар...

Пры нал... з боку... прынята... і, бязумоўна, мо... жа быць... гэта з... мантаж... олы, больніцы, па... будаваў... г новых школ і... наогул... пасунуць наперад... нашу к... ную справу.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ... СР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ З ХЛЕБАМ.

(Зембін).

Зембінскі с-с. правёў шэраг агульных сходаў сярод сялян, на якіх абгаварвалі пытаньні аб калектыўнай здачы лішкаў хлеба каапэрацыі. Сяляне дабрахвотна адгукнуліся на прапанову с.-с.

На днях сяляне ў ліку 12 падвод з чырвонымі сьцягамі здалі каапэрацыі звыш 250 пудоў рознага збожжа. Па астатнім вёскам праводзяцца сходы наконт здачы лішкаў хлеба дзяржаве.

* * *

МАГІЛЕЎ, 30-3. Лупалаўскі раён (11-ты па ліку ў акрузе) пачаў здачу хлеба чырвонымі абозамі.

Каля 300 пудоў здана хлеба ў Чэрнеўскі спажывецкі каапэратыў з трох сельсаветаў—Еганоўскага, Чэрнеўскага і часткова Ждановіцкага.

Другі абоз прыбыў у Сухараўскае спажывецкае таварыства.

Сёньня, у дзень адчыненьня райённага зьезду, здае хлеб трэці вялікі абоз.

Рабочыя фабрыкі „Спар... сяўбу падрыхт...

(Гор. Шклоў, Магілеўск...).

Пытаньне аб вясеньняй пасяўной кампаніі разглядалася на парт-калектыве фабрыкі «Спартак» на камсамольскіх сходах і наогул на шырокіх сходах рабочых. Рабочыя пастанавілі адпрацаваць дзьве гадзіны дарэмна для пасеўкампаніі, што складае прыблізна 350 руб. грошай. На гэтыя сродкі ды з іншых сродак загатоўлена сельска-гаспадарчага інвэнтару: 2 жнейкі, радавая сеялка, 5 плугоў, качкарэз, калёсы, якія стаяць у поўнай спраўнасьці і чакаюць сяўбы.

Акрамя гэтага арганізавана рабоча... чалав... гаспад... кім с... вонаа...

За... езьдзя... выяўле... дапам... ру. З... такса... скары... словал... сустр... падры...

Падрыхтоўка да чысткі савецкага апарату.

Гомель, 1-4. Падрыхтоўка да чысткі нізавога савецкага апарату ад чужых элементаў у разгары. Уся гэтая надзвычайна адказная праца праводзіцца не габінэтным спосабам, а пры дапамозе мас. На прадпрыёмствах рабочыя ня толькі выяўляюць хваравітыя пытаньні ва ўстановах, але вылучаюць рабочыя брыгады для дапамогі РСІ ў выяўленьні цьвёрдалобых бюракратаў, затоеных нашых ворагаў, якія перашкаджаюць карыснай працы. Чыстка пачнецца з апарату Біржы Працы і складу беспрацоўных разумовай працы, якія лічацца на біржы працы, што зьнішчыць магчымасьці пасылкі на працу чужых элементаў у савецкі апарат.

У раёнах пакуль добра разгарнулася падрыхтоўчая праца ў Рэчыцкім раёне, а ў апошніх яшчэ недастаткова. РСІ зазначыла месцам на важнасьць гэтай кампаніі і зьвярнулася з заклікам да ўсяго працоўнага насельніцтва округі дапамагчы выявіць усе недахопы ў працы нізавых, акруговых і рэспубліканскіх устаноў. У сучасны момант у акрузе праводзіцца чыстка саматужна-прамысловых арцеляў ад чужых элементаў.

Будуем кал...

МАГІЛЕЎ, 31-3. У справе арганізацыі новых буйных арцеляў найлепшыя дасягненьні мае Клімавіцкі раён. Там створаны 2 буйныя арцелі. Дзьве суседнія вёскі—Папехінка і Дубровіцы—аб'ядналіся ў адну арцель, у якую ўваходзяць 136 двароў, з плошчаю каля 1000 гэктараў надзельнае зямлі, да якое дадаецца 350 гэктараў з запаснага фонду. З абедзьвюх вёсак толькі 8 двароў не пажадалі ўвайсьці ў арцель, яны будуць выдзелены ў асобны пасёлак.

Другая буйная арцель у гэтым раёне ствараецца ў вёсцы Барысавічах (60 двароў).

У суседнім Касьцюковіцкім раёне пы... ... на арцельны стат... ... земляўпарадкаваны пасёлак Антонаўка (38 двароў).

Некалькі буйных арцеляў (200-300 гэктараў) створана шляхам аб'яднаньня некалькіх суседніх арцеляў. Праца гэтая працягваецца.

Дробныя калгасы арганізоўваюцца пераважна ў Лупалаўскім і Шклоўскім раёнах. Частку іх даводзецца ў часе земляўпарадкаваньня ўліць у бліжэйшыя ўжо існуючыя калгасы.

Дзе-ні-дзе (Шклоўскі раён) паўтараецца мінулагодняя гісторыя: у новыя калгасы пралазяць заможнікі, якія падлягалі-б абрэзцы зямлі.

Л.

ВЯЛІКАЯ КАРЫСЬЦЬ АД САМААБКЛАДАНЬНЯ.

МСЬЦІСЛАЎ, Арш. акр. 31-3. Самаабкладаньне мінулага году, сабранае з вясковага насельніцтва райёну ў суме каля 35000 руб., мела вялікае значэньне ў мясцовых умовах па культурнаму і гаспадарчаму будаўніцтву. Ня мала ўвагі было зьвернута на рамонт шляхоў, мастоў, абсталяваньне пажарнай справы; падцягнута і санітарнае становішча вёскі і інш.

Карысьць ад самаабкладаньня была дэталёва прааналізавана самім насельніцтвам, і ў гэтым годзе самаабкладаньне праведзена па ўсім 325 паселішчам райёну ў разьмеры 25 пр. ад с. г. падатку.

Упарта з прыняцьцем самаабкладаньня ў гэтым годзе была толькі адна вёска Вялікая Рубанаўка, з абсалютнай большасьцю заможных гаспадарак, дзе пытаньне аб прыняцьці самаабкладаньня ставілася на абгаварэньне некалькі раз.

Усяго самаабкладаньня ў райёне прынята на 40235 руб.

Па становішчу на 25-3 паступіла самаабкладаньня 30182 руб. Па некаторым сельсаветам спагнаньне дасягае да 90 проц.

Ня зусім добра абстаіць справа з скарыстаньнем гэтага самаабкладаньня. Так, да гэтага часу сродкаў скарыстана каля 6000 р. Галоўнай прычынай такога недастатковага скарыстаньня зьяўлялася праведзеньне бягучых гаспадарчых заданьняў, як, напрыклад, праведзеньне пасеўкампаніі, 2-х тыднёвіка касы ашчадкасьці і інш.

СЕМЯНЕНКА.

РАСПАЧАЎСЯ ПРАМЫСЛОВЫ ПАХОД.

Гомель, 30-3. *На асобных прадпрыёмствах акругі распачат прамысловы паход. На фабрыцы «Везувій» арганізаваны чатыры брыгады, якія ў сваім паходзе аддаюць шмат увагі палепшаньню якасьці прадукцыі, зьніжэньню сабекаштоўнасьці і барацьбе з прагуламі і нядбайствам. На цукернай фабрыцы працягнут конкурс на лепшага маладога рабочага. На астатніх прадпрыёмствах таксама вызначаюцца брыгады і праводзяцца вытворчыя вечары.*

Адчынілася канфэрэнцыя бязбожнікаў.

МАГІЛЕЎ, 30-3. Сёньня, напярэдадні каталіцкага вялікдня, ачынілася першая акруговая канфэрэнцыя бязбожнікаў.

Магілеўшчына ня можа пахваліцца добрай антырэлігійнай працай. Партячэйкі, камсамол, прафсаюзы ёю бадай-што не займаліся. Ня гледзячы на гэта, бязбожны рух расьце з нізоў.

У Магілеве налічваецца 20 ячэек бязбожнікаў з 800 сябрамі; працуюць 3 сэмінары, якія рыхтуюць кіраўнікоў антырэлігійных гурткоў. Пачала разгортвацца антырэлігійная работа ў раёнах. Журавіцкі раён налічвае 11 ячэек з 400 членамі. У Хоцімскім раёне працуюць 3 антырэлігійныя гурткі. Ёсьць ячэйкі і гурткі і па іншых раёнах, у большасьці ня ўлічаныя.

З другога боку, у акрузе прыкметна ажыўленьне працы рэлігійнікаў, як старых артодаксальных вызнаньняў, гэтак і розных сэкт, у прыватнасьці даволі шырока пашыранай у акрузе „изуверской" сэктыі „шарэшнікаў".

Афарміўшы акруговы цэнтр бязбожнікаў, канфэрэнцыя павінна абмеркаваць і даць яму паказаньні аб пашырэньні арганізацыі новых ячэек і гурткоў, аб разгортваньні і палепшаньні масавай работы, з тым, каб бязбожны рух рос, шырыўся і мацнеў.

Каапэрацыя ў руках „духоўных" асоб.

(Вёска Баршчоўка, Гомельскага райёну).

Да апошняга часу ня можа вызваліцца ад папоўскай апекі наша спажывецкае таварыства.

У мінулым годзе рахункаводам быў сын дзякана Сяргей Жораў, але яго выставілі.

Здавалася-б даволі, дык не!

Старшага брата зьмяніў малодшы і зноў каапэрацыйныя справы ў руках „духоўных" асоб. Канцэлярыя т-ва ня толькі ў яго хаце, але-ж і ў яго адпачывальным пакоі.

Пытаем: чаму гэта Гомельскі райсаюз заранае Жорава, калі наконт яго зваленьня маюцца адпаведныя пастановы.

Сяляне.

Неабходна выправіць хібы ў падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы.

(Па матар'ялах ЦК КПБ і НК РСІ).

Вясеньняя пасеўная кампанія зьяўляецца важнейшаю галінаю працы партыйных і савецкіх органаў у сучасны момант. Між тым у падрыхтоўчай працы да праведзеньня кампаніі заўважаецца цэлы шэраг недахватаў, якія могуць надзвычайна шкадліва адбіцца на выніках яе.

Адным з галоўных недахопаў зьяўляецца неарганізаванасьць у цэлым шэрагу месцаў бядняцка-серадняцкіх груп сялянства навакол канкрэтных пытаньняў вясеньняй пасеўнай кампаніі і непраяўленьне належнай зацікаўленасьці, увагі і ініцыятывы з боку некаторых мясцовых савецкіх органаў і гра... надзкіх арганізацый. Застаўшыся час да сяўбы неабходна скарыстаць для праверкі вынікаў падрыхтоўчай працы вызначэньня і ажыцьцяўленьня тых мерапрыёмстваў, якія па ходу працы неабходны для пасьпяховага праведзеньня кампаніі. Дзеля гэтага неабходна ў першую чаргу завастрыць увагу мясцовых савецкіх органаў на пытаньні вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Вось чаму патрэбна паставіць спэцыяльным пытаньнем аб падрыхтоўцы да сяўбы на райённых зьездах саветаў, якія яшчэ адбываюцца і шырокіх пленумах РВК. Разам з гэтым неабходна арганізаваць скліканьне спэцыяльных сходаў бядняцка-серадняцкіх груп сялянства і нарад дэлегатак для мабілізацыі ўвагі да пытаньняў сяўбы і ўзьняцьця ўраджайнасьці.

Вельмі слаба ў цэлым шэрагу месц настаўлена масавая агрупрапаганда, як, напрыклад, скліканьне спэцыяльных сходаў сялянства, вытворчых нарад, гутарак і г. д. Трэба адзначыць, ... радзе месц яшчэ да апошняга ... закончылі сваю працу сельска-гаспадарчыя курсы, дзякуючы чаму агранэрсанал, які заняты на курсах, ня можа належным чынам абслугоўваць насельніцтва. Патрэбна тэрмінова працу курсаў закончыць і максымальна выкарыстаць агранэрсанал на непасрэдна практычнай працы ў вёсцы для разгортваньня масавай агрупрапаганды па кантрактацыі, аграмінімуму і вернаачышчэньню. Для дапамогі ў праведзеньні масавай працы сярод сялянства неабходна выкарыстаць усе мясцовыя культурныя сілы, як настаўніцтва, хатніка і г. д.

У гэтым годзе органамі НКЗ вызначана шэраг мерапрыёмств арганізацыйнага і агратэхнічнага характару, якія павінны забясьпечыць пашырэньне пасяўных плошчаў і падвышэньне ўраджайнасьці. Дзеля таго, каб дырэктывы па комплексу гэтых мерапрыёмств не засталіся на паперы, неабходна тэрмінова праверыць, што зроблена РВК і с.-саветамі ў справе пашырэньня плошчы засеву, павялічэньня плошчы пад карняплоды і кармавыя травы, палепшаньня сенажацяў, засеву сартавога насеньня, скарыстаньня мясцовых угнаеньняў і належнага выкарыстаньня сельска-гаспадарчага інвэнтару.

Суровы кантроль, сыстэматычная праверка выкананьня дырэктыў дадуць належны эфэкт у працы. Трэба памятаць, што ўзьняцьце ўраджайнасьці ня толькі залежыць ад зернаачысткі і разьмеркаваньня сродкаў вытворчасьці, да чаго зводзяць і ўпрашчаюць іншы раз пасяўную кампанію нізавыя саворганы, а што яно залежыць ад ажыцьцяўленьня ўсяго комплексу арганізацыйных і агратэхнічных мерапрыёмств.

У справе зернаачысткі насеньня некаторыя раёны маюць значныя дасягненьні, аднак гэтага нельга сказаць аб большасьці раёнаў. Па 25 сакавіка ачышчана насеньня па БССР каля 40 процантаў. Зразумела, што гэты процант далёка не зьяўляецца здавальняючым, асабліва калі прыняць пад увагу (аб чым паведамляюць селькоры), што лічбы іншы раз даюцца месцамі павялічанымі ў параўнаньні з сапраўднымі. Вось чаму месцам неабходна ўзмацніць кантроль над зернаачышчэньнем, загрузіць поўнасьцю машыны і асабліва зьвярнуць увагу на зернаачышчэньне сялянскага насеньня ў саўгасах, бо там процант выкананьня заданьня надзвычайна нізкі.

Забясьпечаньне насеньнем паасобных культур, асабліва па такім культурах, як канюшына, вика, лубін і сэрадэля нездавальняюча. Тлумачыцца гэта галоўным чынам слабаю пастаноўкаю мясцовых загатовак, нездавальняючым ходам спагнаньня натуры кантрактацыі мінулага году і позьняе распараджэньне з боку Белсельсаюзу і Белсельтрэсту аб абмене і здачы гатунковага і палепшанага насеньня. Каб не сарваць пашырэньне плошчы пасеву культур канюшыны, лубіну, вікі і сэрадэлі неабходна органам НКЗ, НКГ і Белсельсаюзу ўзмацніць тэмп загатовак гэтых культур на мясцох. Разам з гэтым органы Белсельсаюзу і Белсельтрэсту павінны чым хутчэй правесьці абмен насеньня з каапэрацыяй, каб апошняя магла прасунуць насеньне ў сялянскія гаспадаркі.

Пытаньне кантрактацыі пасеваў мае актуальнае значэньне ў справе хлебазагатовак, барацьбы за ўраджай, пашырэньня пасяўной плошчы, росту таварнасьці і наогул падняцьця сельскай гаспадаркі. Між тым у справе праведзеньня кантрактацыі месца шэраг недахватаў. Позьняе паступленьне плянаў кантрактацыі у райёнах, заблытанасьць і складанасьць інструкцый і дырэктыў, выпадкі неўзгадненьня з месцамі плянаў кантрактацыі і адсутнасьць увязкі іх з працаю зямельных органаў, вось чаму практычная праца па кантрактацыі на мясцох не распачата і месца пагроза невыкананьня вызначаных плянаў. Трэба тэрмінова даць пэрыфэрыі каляндарныя тэрміны кантрактацыі, устанавіць цэны па тым культурам, па якім яны яшчэ не устаноўлены, мець сталы і неаслабны нагляд за выкананьнем гэтых заданьняў. Кантрактацыю неабходна распачаць зараз-жа, прычым працу па кантрактацыі ўвязаць з працаю заморганаў і прыцягнуць да гэтай працы таксама і агранэрсанал.

Трэба адзначыць, што і ў справе арганізацыі майстэрняў па рамонту сельска-гаспадарчых машын амаль што нічога ня зроблена, а сяўба хутка ўжо пачнецца і рамантаваць сельска-гаспадарчыя машыны тагды ўжо будзе позна.

Трэба прыняць тэрмінова меры, каб арганізацыю майстэрняў закончыць чым хутчэй і накіраваць у вёскі. Адначасова павінна быць арганізавана і выслана на вёску вандроўная трактарная майстэрня.

Плян пабудовы новых калгасаў пакуль што выкананы прыблізна на 40 проц., прычым заўважаецца вельмі значны недахоп той, што ў большасьці акруг арганізуюцца дробныя калгасы з плошчаю 60-80 гэктараў. Што належыць да іншых відаў вытворчай с.-гаспад. каапэрацыі, асабліва малочных і пасяльковых таварыстваў, то тут справа шмат горш абстаіць і гэтай працы зусім мала ўлучаецца ўвагі на мясцох. Патрэбна з боку кіруючых органаў НКЗ, БСС і Белкалгассаюзу ўзмацніць нагляд за арганізацыяй новых калгасаў, як у справе выкананьня заданьняў паасобнымі акругамі, так галоўным чынам недапушчэньня арганізацыі калгасаў на плошчы ніжэй устаноўленых СНК БССР норм. Адначасна з гэтым неабходна больш увагі ўлучыць працы па арганізацыі іншых відаў вытворча-каапэратыўных аб'яднаньняў, асабліва пасяльковых і малочных таварыстваў.

Плян пасяўной кампаніі грашовымі сродкамі забясьпечаны на 80 проц., разасыгнаваньне зроблена своечасова і поўнасьцю, за выключэньнем тых патрэб, па якіх НКЗ, БСС і Нар. Кам. Гандлю не прадстаўлены пляны, як, напрыклад, на вапняныя млыны, бульбу, на кантрактацыю насенных культур і на трактары. Паступленьне крэдытаў у саўгасы затрымоўваецца дзякуючы затрыманьню іх Белсельтрэстам на ўплату свае запазычанасьці. Спагнаньне пратэрміновых крэдытаў праводзіць нездавальняюча і месца пагроза выкананьню плянаў. Дырэктыва ўраду аб спрашчэньні парадку выдачы крэдытаў насельніцтву БСБанкам ня выкапана. Усе гэтыя недахваты неабходна зьнішчыць, разам з гэтым БСС і Белсельбанку патрэбна скарыстаць усе фонды каапэраваньня беднаты па пазьней 1-га чэрвеня г. г.

Назіраецца ў гэтым годзе паляпшаньне працы камсамольскіх арганізацый і дэлегацкіх сходаў у падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы, аднак праца гэтых арганізацый не закранула шырокіх мас вясковай моладзі і жанчын. Заўважаецца таксама, што і шэфскія арганізацыі слаба праводзяць працу.

Застаўшыся час да сяўбы трэба скарыстаць і выправіць хібы ў падрыхтоўчай працы, каб самую вясеньнюю пасяўную кампанію сустрэць падрыхтаванымі і правесьці яе пасьпяхова.

М.

НА ФРОНЦЕ КУЛЬТУРНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.

Патрэбна сувязь у працы школ і вучнёўства.

Працоўная школа ў першую чаргу павінна выхоўваць калектыўныя звычаі сярод вучняў. Такой мэты яна можа дасягнуць тады, калі між вучнёўствам асобных школ і настаўніцтвам будзе ўтворана належная сувязь. Настаўніцтва больш-менш здавальняюча разьвязала пытаньне аб сувязі: у гарадох утвораны гурткі групаводаў і выкладчыкаў па асобных дысцыплінах, па вёсках-пэдрады сельсаветаў. Гурткі абгаварваюць пляны працы, прыстасаванасьць падручнікаў да праграмы і сямыя праграмы, мэтады выкладаньня і іншае. Праўда, часта гурткі потым не абгаварваюць вынікаў праробленага і таго, як плян праводзіўся ў жыцьцё. Але вынікі працы саміх гурткоў здавальняючыя, асабліва малодшых груп, што назіраецца, напрыклад, па школах гораду Амсьціслаўля.

Трэба далей пашырыць сувязь у працы настаўніцтва праз наведваньне лекцый таварышоў і ўдзел у пасяджэньнях пэдрад. Для гарадоў гэта магчыма. На вёсках такая сувязь па некаторых райёнах праведзена шляхам узорных лекцый, на якіх прысутнічаюць настаўнікі ўсяго сельсавету. Зусім другі малюнак назіраецца, калі перайсьці да сувязі між вучнямі. Тут поўная адарванасьць у іх працы і жыцьці. Пакуль толькі Менск правёў вучнёўскую канфэрэнцыю, пра іншыя, нават і акруговыя гарады, нічога ня чуваць, пра дробныя і казаць ня прыходзіцца. А сувязь вучнёўства вельмі неабходна. Мы ведаем, што школы праводзяць тыя ці іншыя мерапрыёмствы па арганізацыі вучняў, самі вучні вядуць працу самакіраваньня. Па школах працуе шмат вучнёўскіх гурткоў. Такім чынам, ёсьць шмат агульных пытаньняў вучнёўскага жыцьця і працы, ёсьць той ці іншы вопыт, аб чым магчыма правесьці гутарку па аб'яднаных вучнёўскіх канфэрэнцыях. Самі настаўнікі могуць атрымаць тут багаты матар'ял выхаваўчага і пэдагагічнага зьместу.

У Амсьціслаўлі зроблен вопыт такога аб'яднаньня. На вялікі жаль настаўніцтва не прыняло ў гэтым вопыце належнага ўдзелу, а таму ён атрымаўся ня зусім добры. Галоўнай часткай вечару былі скокі. Але важан пачын, ініцыятыва вучнёўства.

Трэба пэдрадам і вучкомам абгаварыць пытаньне аб ажыцьцяўленьні такой сувязі праз канфэрэнцыі, вечары, дзе галоўным быў-б ня скокі, а культурная частка: чытаньне вучнёўскіх твораў, інсцэніроўкі, гульні, сьпевы, магчымы і скокі пад кіраўніцтвам настаўнікаў.

На вёсцы бліжэйшыя школы таксама могуць правесьці канфэрэнцыі, а дапамагаць павінны раённыя сямігодкі праз дэлегатаў.

Архіпаў.

Дзе гаспадар горацкай кнігарні?

Цяжка без абурэньня гаварыць аб парадках горацкай кнігарні.

Зайдзіце, калі ласка, у гэту «кнігарню». Першае, што вы там пабачыце гэта—нейкія пакі, кулі ў рагожы, горы плеценых кошыкаў, крэслаў, мётлы, мацёлкі. Іх столькі, што і навярнуцца сьльга. Цяць асоб у краме і мостаму ўжо цяжка ўбіцца туды. Далей вы бачыце цэлую сьцэнку пісьмовых прыладаў і ў самым кутку—кучка кніг. На сьцепках вісяць партрэты разалюцыйных правадыроў. Асобны куток займаюць партрэты расейскіх пісьменьнікаў—Някрасава, Гогаля і інш.

Хачу купіць некалькі партрэтаў беларускіх пісьменьнікаў. Аказваецца, ёсьць толькі партрэт Чарота і той дзесьці ляжыць пад мётламі так далёка, што і не знаглі яго дастаць.

А папрасіце патрэбную вам кнігу, дык вы ніколі яе не дастанеце. У вітрыне сярод расейскіх кніг (і то такіх, якіх, мабыць, ніхто ня купляе) 2-3 беларускія. Няма чаго і казаць аб тым, каб вы тут знайшлі літаратурныя навінкі, як «Сонечны паход»—Чарота, ці раман „Зямля"—Чорнага. Тут няма ўсіх тых „навінак", якія выйшлі ў працягу ўсяго мінулага году. Не пабачыце таксама і дзіцячай літаратуры—ні для дашкольніка, ні для школьніка. Нічога кнігарня не гавора аб тым, ці ёсьць на беларускай мове антырэлігійная літаратура; ня відаць ніводнай п'есы, ніводнай брашуры аб сельскай гаспадарцы з сэрыі «Сялянская бібліятэка», няма выданьняў на мовах нацменшасьцяў, выданьняў Інбелкульту, ніводнай часопісі беларускай, зусім мала палітычнай літаратуры.

Некалькі слоў аб тым, як кнігарня абслугоўвае насельніцтва.Ідзеш у кнігарню ў пятніцу ці ў нядзелю (кірмашовыя дні)—кнігарня зачынена то прычыны распакоўкі тавару, то «перавучот» вісіць на дзьвярах, то нічэ якое ліха, і заўсёды прычына знаходзіцца, каб яўраз у тыя дні, калі можа быць найбольшы гандаль, калі сяляне робяць наступ на кнігарню—кнігарня зачынена. У суботу ня раз кнігарня зачыняецца а 2 гадз. дню, хоць выхадным днём зьяўляецца панядзелак. Людзі, занятыя працай, могуць толькі ў поўныя дні, ці нават гадзіны пайсьці ў горад па справах. І вось той, хто піша гэтыя радкі, чатыры разы выбіраўся ў кнігарню і да абеднешняга перапынку, і пасьля гэтых гадзін, і толькі ў пяты раз знайшоў дзьверы кнігарні без замка.

Дрэнна было тады, калі кнігарня была пад загадам БДВ, а яшчэ горш, як яна перашла ў загад спажывецкага т-ва. Ранейшая загадчыца хоць адным вухам чула, што ёсьць якісь пісьменьнік «Якобс» (прозьвішча гэтага «Якобса» так і не пасьпела яна даведацца), а цяпер новыя працаўнікі і гэтага ня ведаюць. Яны, здаецца, і малапісьменныя, бо з паўгадзіны сьлібізуюць загаловак той ці іншай кнігі. Дзе-ж ужо ад іх вымагаць, каб яны былі хоць крыху знаёмы з прозьвішчамі аўтараў або з назовамі твораў. Просіш, напр., паэму «Сымон Музыка», а яна табе дае паэмы З. Бядулі і даводзіць, што гэта тое, чаго ты просіш. Просіш літаратуры з бібліятэкі школьніка, а яна дае задачнікі. А ўрэшце знаходзіць выхад просты—«няма» і ня турбуецца пашукаць, бо ня ведае дзе і чаго шукаць.

Горкі—культурны асяродак. Тут знаходзіцца Акадэмія С.-Г., рабфак, розныя школы, розныя курсы тут праводзяцца, на якія прыяжджаюць слухачы з глухіх куткоў нашае краіны. Патрабуе кнігі і студэнт (а іх паўтары тысячы) і навуковы працаўнік, кнігі патрабуе і настаўніцтва мясцовае і райёнае, і школьнік, і селянін. І такая нядбайнасьць, такая няўвага да справы пашырэньня кнігі, прасоўваньня яе ў масы—гэта злачынства.

Чаму гэтай справай не пацікавіцца ні райком партыі, ні гарсавет, ні іншыя савецкія органы? Хто аб гэтым павінен дбаць?

Нельга праз пальцы глядзець на гэту важную ў культурным жыцьці райёну пляцоўку.

Пэм.

СЬВЕТАЧ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ КУЛЬТУРЫ.

Да 10-годзьдзя вышэйшай сельска-гаспадарчай асьветы на Беларусі.

7 красавіка г. г. споўніцца роўна 10 год існаваньня новай вышэйшай сельска-гаспадарчай школы Беларусі.

Да рэвалюцыі на тэрыторыі сучаснае БССР ня было ніводнае вышэйшае навучальнае ўстановы ў працягу перыяду ў 65 год: ад 1864 да 1919 г. Гэты перыяд быў тыповым часам культурнага застою беларускага краю.

Да гэтага перыяду ў так званым па-старому Заходнім краі старой Расеі справа абстояла лепш. Тут былі дзве вышэйшыя навучальныя ўстановы: унівэрсытэт у Вільні і Земляробчы Інстытут у Горках.

Прымаючы пад увагу, што Горкам пасьля рэвалюцыі прышлося ў другі раз адыграць ролю рассадніка вышэйшае сельскае-гаспадарчае адукацыі, дарэчы ўспомніць гісторыю старога Горы-Горацкага Земляробчага Інстытуту.

Гэта была першая вышэйшая сельска-гаспадарчая школа ў Расеі. Думка аб такой школе зьявілася ў 30 гадох мінулага стагодзьдзя.

«Указ» аб заснаваньні «Горы-Горацкага Земляробчага Інстытуту» агалошан у 1837 г. У той-жа год распачата была арганізацыя і пабудова інстытуту.

У 1840 г. Земляробчы Інстытут быў адчынены, зроблен прыём студэнтаў і пачаў функцыянаваць.

Першыя прафэсары былі ўзяты з Дарпцкага унівэрсытэту пасьля падрыхтоўкі іх у занежнай камандыроўцы (у Нямеччыне).

Чаму гэухі горад Горкі быў месцам заснаваньня самага першага ў Расеі с.-г. інстытуту? Бо тады, амаль што 100 год таму назад, у Расеі ня было яшчэ ніводнай чыгункі, зносіны і пошта падтрымліваліся выключна на конях, правінцыяльныя цэнтры яшчэ ня востра вызьвіліся, перспэктыва разьвіцьця гарадоў ня ўлічвалася і думалі, што для Земляробчага Інстытуту патрэбны ў першую чаргу буйны маёнтак. У Горках і быў гэткі маёнтак, належачы графу Салагубу і адабраны ў дзяржаўны фонд за даўгі графа.

З 1844 году інстытут пачаў выпушчаць аграномаў з годнасьцю кандыдатаў сельскае гаспадаркі, а праз некалькі год даваць годнасьць доктара сельска-гаспадарчых навук.

У часе польскага паўстаньня, у 1863 годзе, студэнты і частка прафэсароў прымалі ўдзел у паўстаньні і ў той-жа год інстытут быў зачынены.

Такім чынам, Горы-Горацкі Земляробчы Інстытут праіснаваў 23 гады. За гэты час ён выпусьціў каля 600 аграномаў з вышэйшай адукацыяй. Лепшымі з іх былі ўкамплектаваны першыя прафэсарскія катэдры Пятроўска-Разумоўскае Акадэміі Сельскае Гаспадаркі, якая была адчынена ў 1865 годзе і зьявілася другой вышэйшай сельска-гаспадарчай школай у старой Расеі (Сьцебут, Чорнапятаў, Маркоўскі і інш.). Таксама са сьцен старога Горы-Горацкага Інстытуту вышаў выдатны фізыялёг Сячэнаў, былы праф. пецярбурскага унівэрсытэту і акадэмік.

Вучэбнымі падсобнікамі Горы-Горацкі Інстытут, як відаць, быў добра абсталяваны. Гэткія падсобнікі, як Дэндралёгічны парк, абора, ферма, пладовы сад і зараз выкарыстоўваюцца Беларускай С.-Г. Акадэміяй. Навуковыя прылады (мадэлі, гэодэзічныя прылады, кнігі) з пометкаю «Г.-Г.З.І.», г. зн. «Горы-Горацкі Земляробчы Інстытут», да гэтага часу маюцца ня толькі ў Беларускай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі, але і ў навучальных установах Ленінграду, Харкава, Масквы, куды яны былі перададзены пасьля зачыненьня Г.-Г. З. Інстытуту. Як відаць, ня толькі іх было шмат, але выконваліся яны (напр. прыборы, мадэлі) па спэцыяльным заказе за межамі

Зараз, пасьля рэвалюцыі, Горкам прышлося ў другі раз адыграць ролю рассадніка вышэйшае сельска-гаспадарчае адукацыі.

Як толькі ў маладым СССР узьнята было пытаньне аб павялічэньні ліку ВУЗ'аў, у першую чаргу ўспомнілі пра добрыя агранамічныя традыцыі былога Земляробчага Інстытуту ў Горках. І грамадзкія агранамічныя колы, і Наркамасьветы, і НКЗ выказаліся за аднаўленьне Земляробчага Інстытуту ў Горках.

У той час Горацкі павет быў у складзе РСФСР і пастановаю Калегіі Наркамасьветы 7 красавіка 1919 году заснаваны ў Горках Горацкі Сельска-Гаспадарчы Інстытут. Прымаючы пад увагу тое, што на месцы да гэтага тэрміну амаль-што ўся падрыхтоўчая праца была ўжо выканана, з 7 красавіка 1919 г. новы Горацкі Сельска-Гаспадарчы Інстытут і пачаў сваё існаваньне ў складзе арганамічнага, лясного і інжынэрна-мэліярацыйнага факультэту.

У 1923-24 навучальным годзе Горацкі Інстытут ужо пачаў выпушчаць вучоных аграномаў, [вучоных лесаводаў, інжынэраў-мэліяратараў.

У 1922 годзе на [тэрыторыі Беларусі заснаваны быў яшчэ [адзін Сельска-Гаспадарчы ВУЗ: Сельска-Гаспадарчы Інстытут у Менску.

У 1924 годзе Горацкі Сельска-Гаспадарчы Інстытут разам з узбуйненьнем БССР перайшоў да Беларусі.

У 1925 годзе ўрад БССР аб'яднаў абодвы Сельска-Гаспадарчыя Інстытуты ў адзін ВУЗ, Менскі Інстытут пераводзіцца ў Горкі, і на месцы Горацкага Інстытуту засноўваецца Беларуская Акадэмія Сельскае Гаспадаркі. Да ранейшых 3-х факультэтаў у той-жа год дадаецца чацьверты факультэт—Земляўпарадкаўчы.

Такім чынам, 7 красавіка г. г. зьяўляецца днём дзесяцігадовага існаваньня вышэйшае с.-г. адукацыі за тэрыторыі Беларусі.

Аграномы, лесаводы, мэліяратары павінны ўспомніць, што дзесяць год таму назад іх Беларуская alma mater заклікана новым жыцьцём да новага існаваньня.

Беларуская Сельска-Гаспадарчая Акадэмія, зразумела, адзначыць 10-годзьдзе вышэйшае сельска-гаспадарчае школы на тэрыторыі Беларусі. Нажаль, Акадэмія пакуль-што яшчэ не агаласіла парадку, якім спосабам яна адзначыць 10-гадовы юбілей вышэйшай сельска-гаспадарчай школы ў Беларусі.

ПРАФ. С. П. МЕЛЬНІК.

г. Горкі. С.-Г. Акадэмія.

Савецкая школа—прапагандыст ідэй Мопр'у.

Кожны вучань савецкае школы ўжо ведае, што ўвесь сьвет дзеліцца на два лягеры: працу і капітал, працоўных і буржуазію, эксплёатуемых і эксплёататараў, і што паміж гэтымі абодвымі лягерамі знаходзіцца прорва клясавых супярэчнасьцяў, якія могуць быць вырашаны толькі бязупыннай, няшчаднай барацьбой.

Школьнай працы ў гэтым напрамку значна дапамагае разгорнутая праца ячэек Мопр'у, куды ўваходзяць і настаўнікі і дзеці. Праца ячэйкі Мопр карысна ня толькі з пункту гледжаньня ўзмацненьня інтэрнацыянальных момантаў выхаваньня і пашырэньня грамадзкасьці сярод вучняў, але яна накіравана і на пагыбленьне выхаваньня ў тым-жа напрамку сярод бацькоў і сям'і.

Ячэйка Мопр школы № 5 гор. Менску, куды ўваходзяць усе настаўнікі школы і вучні (некаторыя малодшыя групы цалкам зьяўляюцца сябрамі Мопр'у), займаецца ня толькі зборам сяброўскіх грошай, а вядзе вялікую грамадзка-карысную працу сярод вучняў усяе школы і сярод іх бацькоў, выяўляючы ролю і значэньне Мопр'у ў клясавай барацьбе.

У зьвязку з 5-годзьдзем Мопр'у на Беларусі, 31 сакавіка г. г. ячэйка наладзіла агульны сход сваіх сяброў, запрасіўшы на яго і бацькоў вучняў.

Вялікая заля школы да адказу была запоўнена дзецьмі і іх бацькамі. Палітэмігрант тав. Салагуб зрабіў даклад аб становішчы палітвязьняў у буржуазных турмах, галоўным чынам у Польшчы, затрымаўшыся на ўспамінах з уласных перажываньняў аб часе няволі ў віленскай турме на Лукішках, сэкратар ЦК Мопр'у т. Калмык даў сталае тлумачэньне аб працы Мопр'у на Беларусі за 5 гадоў, старшыня ячэйкі Мопр'у ў школе т. Каменскі—аб працы ячэйкі ў школе, і настаўніца т. Лаўрыновіч—аб ролі жанчыны ў гэтай арганізацыі.

Сіламі малодшых груп школы была падрыхтавана адпаведная інсцэніроўка і дэклямацыя, таксама тав. Салагуб дэклямаваў уласныя вершы, напісаныя ім седзячы за панскімі кратамі на Лукішках.

Адным словам, вечар зрабіў надзвычайна добрае ўражаньне на бацькоў, вучняў і ўсіх удзельнікаў і выявіў агульную прыхільнасьць да гэтае справы. Сход аднагалосна ўхваліў наступную рэзалюцыю:

«Заслухаўшы даклад т. Салагуба аб жыцьці палітвязьняў у Польшчы, сход бацькоў і дзяцей першага канцэнтру 5 савецкае школы асабліва завастрае ўвагу ўсіх бацькоў і дзяцей школы, а таксама і ўсяго настаўніцкага складу, на неабходнасьць усямернага пашырэньня працы Мопр'у ў школе сярод усіх вучняў і праз іх—сярод іх бацькоў. Сход са здаволеньнем адзначае актыўнасьць настаўніцтва 5 школы ў вязінай працы па арганізацыі дапамогі зарубежным барацьбітом за справу рэвалюцыі і заклікае ўвесь школьны калектыў уступіць у шэрагі Мопр'у.

Мы заклікаем усе школы, усіх настаўнікаў, запраўды жадаючых дапамагчы пралетарыяту ў яго барацьбе з капіталам, уступіць у шэрагі Мопр'у і разьвіць жывую творчую працу ў ім.

Хай жыве барацьба і перамога працоўных мас ва ўсім сьвеце!».

Праца ячэйкі Мопр'у школы № 5 знойдзе падтрыманьне з боку вучняў, настаўніцтва і бацькоў іншых школ як гор. Менску, так і ўсёй Беларусі.

Ів. Масюкевіч.

Клюбная праца ў Амсьціслаўлі закінута

У гор. Амсьціслаўлі ёсьць два клюбы: рабоча-партыйны і камсамольскі. Першы з іх мае значную колькасьць сваіх сяброў. Як першы, так і другі з матар'яльнага боку райвыканкомам забясьпечаны добра. Адпушчаны значныя сродкі на здабыцьцё адпаведнае літаратуры, на апал, асьвятленьне, на тэхнічны персанал і канцэлярскія патрэбы. Абодвы клюбы знаходзяцца ў добрых памяшканьнях. Адным словам, умовы для разгортваньня працы добрыя.

Заглянем у гэтыя клюбы і прыгледзімся як там гэта праца разгортваецца?

Заходзім увечары. У клюбах—беспарадак. Невыпасімы холад. Сталы і лаўкі ў беспарадку. Аб чыстаце і гаварыць ня прыходзіцца. Адна-дзьве «тусклівыя» лямпачкі „азараюць" шумны пакой чытальні. Гул, сьмех і рогат напаўняюць чытальні.

Чаму гэта тут так? Дзе праўленьні клюбаў? Дзе сябры клюбу—гаспадары і арганізатары клюбнае працы? Дзе праца, зьвязаная з аснаўнымі палітычнымі задачамі моманту? Дзе вечары, даклады, лекцыі і выстаўкі—выхаваўчыя аб'екты моладзі і насельніцтва? І, урэшце, дзе тыя, хто пасылаў у клюбы такіх кіраўнікоў, якія на сваім культурна-палітычным разьвіцьці і навыках арганізацыйна-грамадзкай працы не адпавядаюць свайму прызначэньню клюбных працаўнікоў?

Працы няма, а яна патрэбна, ды яшчэ які!

П. Скокаў.

Шырэй разгарнуць працу.

Ужо досыць добра было разгорнута пытаньне праз менскія газэты аб удзелі лепшай часткі рабочых і сялян у завочны рабфак, які дае магчымасьць з малой адукацыяй падрыхтавацца да паступленьня ў ВНУ, не адрываючыся ад вытворчасьці.

Але-ж трэба адзначыць, што ў гэтым напрамку пакуль што па саюзнай лініі нічога ня зроблена ня толькі ў акругах і райёнах, але і ў Менску.

Праца па вярбоўцы ў рабфак ідзе кепска. Прафэсыйныя саюзы і грамадзкія арганізацыі ня ўлічваюць свае ролі ў гэтым напрамку.

Сьвяткуючы 10-годзьдзе рабфаку, мы адзначалі, што лепшым спосабам у справе пралетарызацыі ВНУ зьяўляюцца рабочыя факультэты, якімі працоўныя клясы павінны ўзброіцца.

Зараз неабходна прафэсыйным саюзам праз завкомы і фабкомы растлумачыць рабочым неабходнасьць папаўняць нашы ВНУ праз рабочыя факультэты.

На вёсках райвыканкомы, партыйныя і камсамольскія арганізацыі павінны зьяўляцца застрэльшчыкамі і ў сэнсе ўцягненьня ў асьвету бядняцкіх і сераднякіх пластоў вёскі, прычым пераважную ўвагу належыць аддаць уцягненьню ў рабфакі батрацтва.

Калі навука будзе ў руках пралетарыяў, хутчэй разгорнецца справа пабудовы сацыялізму.

Шырэй разгорнем працу ў гэтым напрамку.

С. Я.

Удзел студэнцтва ў с.-г. выстаўцы.

Студэнтва Беларускай С.-Г. Акадэміі пастанавіла ўсямерна дапамагаць арганізацыі ўсебеларускай с.-г. выстаўкі. У часе летняга адпачынку і практычных работ студэнты будуць праводзіць шырокую растлумачальную кампанію сярод сялянства аб задачах выстаўкі і за ўдзел у ёй шырокіх сялянскіх мас.

Хата-чытальня павінна шырока разгарнуць працу па калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Пытаньні калектывізацыі сельскае гаспадаркі ў сучасны момант маюць выключна важнае значэньне.

«У сучасны момант задача аб'яднаньня і пераходу дробных сялянскіх гаспадарак у буйныя калектывы павінна быць пастаўлена як асноўная задача партыі ў вёсцы». (З рэзалюцыі XV партыйнага зьезду).

Вясковыя палітыка-асьветныя ўстановы павінны аддаць максімум увагі пытаньням калектывізацыі сельскае гаспадаркі, перабудовы яе на сацыялістычны лад.

У райёне сваёй дзейнасьці праз чырвоныя куткі, актыў камсамольцаў трэба хатніку павесьці сярод бядняцка-сераднякае часткі насельніцтва шырокую агітацыю за аб'яднаньне ў калгасы, падмацоўваючы ўсю агітацыйную працу прыкладамі з жыцьця бліжэйшых калгасаў і камун.

Усю працу па калектывізацыі хатніку неабходна будаваць на прынцыпах практычнае дапамогі бядняцка-сераднякага насельніцтва пры аб'яднаньні ў калгасы, надаць ёй характар сыстэматычнай, плянавай, а не кампанейскай працы і праводзіць шляхам:

а) па галіне масавай працы.

1) Гутарак і галосных чытак з сялянствам на тэмы аб калектывізацыі гаспадарак, перавагах калгасаў над дробнымі сялянскімі гаспадаркамі, выгадах калгасаў і г. д.

2) Наладжваньня сялянскіх экскурсій у бліжэйшыя калгасы, камуны, буйныя таварыствы, дзе-б бядняк і сярэдняк відавочна знаёміўся-б з жыцьцём і працай калгасаў, з перавагай іх над дробнымі сялянскімі гаспадаркамі.

б) Па галіне бібліятэчнай і справачнай працы.

У першую чаргу бібліятэку кожнае хаты-чытальні патрэбна папоўніць літаратурай аб калектывізацыі сельскае гаспадаркі, якую праз выстаўкі і кніганошаства трэба прасоўваць у шэрагі насельніцтва. А таксама скарыстоўваць гэту літаратуру для галосных чытак. Акруговым і райённым бібліятэкам неабходна скамплектаваць па некалькі такіх бібліятэк і безадкладна распачаць абслугоўваньне імі глухіх вёсак.

Шырока павінна быць разгорнута і справачная праца.

в) Па галіне гуртковай мастацкай працы і насьцэнкай газэты.

Сельска-гаспадарчым і каапэрацыйным гурткам у праграму сваёй працы трэба ўключыць і пытаньні калектывізацыі сельскае гаспадаркі, а таксама дапамагаць хатніку ў штодзённай працы.

Ва ўсіх насьценных газэтах, што выдаюцца пры вясковых палітыка-асьветных установах, неабходна вылучыць куток, у якім, побач з матар'ялам агітацыйнага зьместу, зьмяшчаць матар'ялы з жыцьця суседніх калгасаў і камун.

Па галіне мастацкае працы можна скарыстоўваць п'есы, апавяданьні і інш. пры наладжваньні масавых вечарын. У даным выпадку дзеля пастаноўкі драмгурткам раім скарыстоўваць п'есу драматурга Іўлі Гурскага пад назвай «Дрыгва», якая як раз і малюе пэступовы пераход вясковае беднаты да калектывізацыі. Мастацкая праца павінна быць цесна ўвязана са ўсёй працай хаты-чытальні.

Апроч працы па арганізацыі новых калгаспадарак, камун, арцеляй і г. д. хатам-чытальням трэба шырока разгарнуць палітыка-асьветную працу і ў існуючых ужо калгасах і камунах.

Папершае, кожная хата-чытальня павінна ўзяць на вучот усе калгасы, камуны, арцелі райёну сваёй дзейнасьці, добра вывучыць іх культурнае жыцьцё і распачаць сталую сыстэматычную палітасьветную працу ў іх.

У кожнай калектыўнай гаспадарцы, камуне трэба арганізаваць чырвоны куток. Забясьпечваць яго адпаведнай літаратурай, пры дапамозе актыву, наладжваць у калгасах і камунах даклады, лекцыі, наладзіць пры чырвоным кутку выданьне насьценгазэты.

М. Сеўрун.

МАЗЫРСКІ ПЭДТЭХНІКУМ—НА ШЛЯХУ АЗДАРАУЛЕНЬНЯ.

(Па матар'ялах НКА).

У часе абвастрэньня клясавае барацьбы, калі клясавы вораг павёў атакуе наступленьне ня толькі на культурна-палітычным і эканомічным фронце, але і на фронце ідэалёгічным, пытаньні правільнай пастаноўкі выхаваньня інтэрнацыянальнага, антырэлігійнага і нават палавога выхаваньня набываюць асаблівую важнасьць.

Чоткая, яскрава выражаная пралетарска-клясавая пастаноўка вучэбна-выхаваўчай працы ў навучальнай установе асабліва ў тэй, якая рыхтуе будучых выхавацеляў, настаўнікаў—працаўнікоў вёскі, на абавязку іх ляжыць выхаваць будучае пакаленьне з марксыцкім сьветапагляданьнем, гэта адзін з галоўных участкаў на сьветным фронце.

Як-жа мазырскі пэдагагічны пэдтэхнікум справіўся з гэтай задачай?

Праўда, гэты тэхнікум яшчэ зусім малады—існуе 3-ці год.

З першага-ж году яго арганізацыі 1926 годзе пры абмяжованьні першага набору на два раўналеглых курсы ў першы раз не ўдалося набраць саго складу, і прышлося абвясьціць дадатковы прыём. Дадатковы прыём шырока адчыніў дзьверы для сацыяльна чужых і нават варожых элементаў—дзяцей папоў, кулакоў і г. д.

Адсутнасьць своечасовага пралетарскага нагляду зразу адчулася ў працы камісіі, якая палічыла, што лепш чыць хоць шкодны элемэнт, чым абкінуць месцы пустымі.

Камісія сьвядома залічала многіх ворагаў на вучобу, ведаючы іх, а ў дадатак шмат прышлося прымаць і па фальшывых дакумэнтах.

Так, залічана ст. Шахно-дачка служыцеля рэлігійнага культу, лічылася, як сялянка; ст. Ліўшыц—дачка буйнага гандляра і шмат і іншых.

Калі глядзець на лічбы, якія складзены на падставе анкет, то твар пэдтэхнікуму будзе: дзяцей рабочых—12,9 проц.; батракоў і дзяцей членаў калгасаў—1,9 проц.; дзяцей сялянскай беднаты ўсяго 6,2 проц.; сераднякоў 33,4 проц.; заможных — 3,7 проц., служачых—24 проц.; выхав. дзіц. дамоў—2,9 проц. і іншых—2,9 проц.

Калі-ж камісія занялася дэталёвым вывучэньнем, дык выявілася, што ў агульным складзе студэнцтва 10 проц. чужых (па вестках, якія дадзены дадаткова мясцовымі ўстановамі).

Наліччa такога значнага процанту чужога элемэнту дало сябе адчуваць і паслужыла спрыяючай глебай для разьвіцьця нездаровых, антысавецкіх настрояў.

Гэтыя настр і ня мелі дастатковага адпору з боку стударганізацыі, а тым больш гэта ўскладнялася, што хворыя зьявішчы мелі сабе ідэалёга з асяродзьдзя выкладчыкаў у асобе Піскука.

Антысэмітызм, нацыяналізм, шавінізм, сялянскія настроі і мяшчаньства.

Антысэмітызм.

Насіцелямі ўсіх хворых настрояў і зьявішч зьяўляліся дзеці папоў, кулакоў, якія расказвалі антысэмітскія анэкдоты і лічылі гэта зусім нармальным зьявішчам. Наст. Піскун падтрымліваў гэту групу і высьмейваў студэнтаў яўрэяў: «яўрэі ня будуць настаўнікамі ў вёсцы», высьмейваў яўрэйскі акцэнт і пусьціў па тэхнікуму «азарызм», г. зн. яўрэйскі акцэнт і в мяст. Азарычы, Мазырскае акругі. Калі студэнт часам не атрымае кнігі з бібліятэкі, то ўлепіць моцныя слоўцы: „для яўрэяў, дык усё ёсьць, а для рускага нічога".

Нацыянальны склад студэнцтва: беларусаў 70,1 проц., яўрэяў 26,4 пр., палякаў 1,6 проц. і расейцаў — 1,9 проц. Карэньні антысэмітызму ў тэхнікуме цягнуцца з некаторых сямігодак Мазыршчыны. Вызначаліся больш за іншых выхаванцы Пятрыкоўскай і Калінкавіцкай сямігодак—дасьледаваныя факты ў тэхнікуме гэта падмацоўваюць.

Нацыяналізм і шавінізм.

Ідэалёгам нацыяналізму і шавінізму быў усё той-жа Піскун. Пры выкладаньні бел. літаратуры ідэалізавалася беларуская вёска і сялянства, слова рабочы ўжывалася выпадкова. Беларуская літаратура [характарызавалася як літаратура наогул, бяз клясавай яе сутнасьці. Беларуская мова высьвятлялася як адна з прыгажэйшых і гучнейшых моваў. Марксыцкага падыходу да тлумачэньня літаратуры ня было. Апрача высьмейваньня яўрэяў, Піскун адкрыта казаў: „палякаў я цярпець не магу", а пасьля прасіў прабачэньня ў студэнтаў палякаў.

Сялянскія настроі.

Асноўнай групай студэнцкага складу зьяўляюцца сяляне сераднякі,—33,4 проц., але ёсьць—3,7 пр. кулакоў. Група апошніх распаўсюджвала чуткі сярод студэнтва, што «Савецкая ўлада абірае сялян», што «сяляне як хадзілі, так і будуць хадзіць у лапцях».

„Антырэлігійныя" настроі.

Сярод студэнцтва ёсьць антырэлігійнікі называрат. Часта прыкмячаліся выпадкі, калі студэнты ўдзельнічалі ў царкоўным хоры ў аднэй з мазырскіх цэркваў.

Настаўнікі часьцяком, пад рэлігійныя сьвяты, наладжвалі банкеты ў гонар гэтых дзён. У Піскуна на кватэры быў абраз; ён казаў, што гэты абраз належыць гаспадыні, але забыўся, што гаспадыня—яўрэйка.

Нездаволенасьць будучай прафэсіяй.

Частка студэнтаў у пэдтэхнікум папала выпадкова. Яны глядзяць на тэхнікум, як на мосьцік, каб праз яго пралезьці ў ВНУ. Такіх настрояў шмат і ўсе яны ідуць ад «розных сынкоў і дачушак».

Адна студэнтка, дачка былога гандляра, кажа: „4 гады правучуся, а там можа зьменіцца ўлада, а тады пабачым, што з мяне стане».

Настаўнікамі быць многія не жадаюць: „што я атрымаю ад гэтага—сухоты»? Папалі яны ў пэдтэхнікум пасьля таго, як іх ня прынялі ў іншыя тэхнікумы.

Антысавецкія настроі з боку.

У тэхнікум прынята сёлета вучаніца з пятрыкоўскай сямігодкі. Яна была пад судом за тое, што дэманстратыўна пабіла бюст Леніна і за гэта атрымала 3 гады ўмоўна. Яна і ў тэхнікуме выяўляе сябе, як антысэмітка і варожа настроеная. У апошні час зьвернута належная ўвага на гэтыя балячкі пры вывучэньні становішча тэхнікуму.

Разьмеркаваньне стыпэндый.

Стыпэндыі часта прызначаліся тым, якія добра вучацца, а ім атрымоўваць стыпэндыі не належыла па матар'яльным становішчы. Былі выпадкі, калі за акадэмпаспяховасьць не давалі стыпэндыі тым, якім ні ў якім разе нельга было здаваўляць. Пры разьмеркаваньні стыпэндый практыкаваўся пратэкцыянізм і асабліва з боку Піскуна. Былі выпадкі, калі нават паповічам давалі стыпэндыі і ведалі, што яны паповічы.

Камсамольская частка складае 33,7 проц. агульнага ліку студэнтаў. Але пазьней высьветлілася, што і ў камсамольскай ячэйцы выкрыты варожыя элементы, якія захавалі сваё сацыяльнае паходжаньне і матар'яльнае становішча.

Піскун ня любіў камсамолу і асабліва камсамольскага актыву і блізкім да сябе студэнтам забараняў уваходзіць у КСМ.

Пазьней уведаем чаму?

Адміністрацыйны зажым.

З першага-ж году заснаваньня тэхнікуму быў узят напрамак на жорсткую дысцыпліну і націснулі на акадэмізм, на што ў асноўным дана была ўстаноўка інспэктарам НКА Сіняковым, які рабіў агляд у першы год заснаваньня. У мінулым годзе інспэктарскага агляду зусім ня было.

Акадэмізм заядаў студэнцтва. Грамадзкая праца праводзілася па-засьценамі тэхнікуму, але яна ня мела кіраўніцтва і вучоту.

Разьмеркаваньне часу студэнцтва ня было і гадзін на клюбную працу не вызначалася.

Усё гэта адбівалася на выхаваўчым баку працы і ў выніку прывяло да такіх хворых зьявішч. Газэты выпісваліся, але мала чыталіся, бо перашкаджала акадэмічная перагрузка.

Дысцыпліна была часта грубая. Усе выкладчыкі імкнуліся штучна ўтвараць аўтарытэт і таму настаўніку, які гэтага не заслугоўваў, а ўсё гэта напружвала адносіны паміж часткай выкладчыкаў і студэнтаў.

На стударганізацыі мала зварачвалі ўвагі і не дапамагалі разгортваньню працы, а наадварот—тармазілі яе.

«Любімчыкі» і ахвяры.

Некаторыя настаўнікі мелі сабе «любімчыкаў», якія павінны былі дэталёва інфармаваць аб усім, што дзеецца ў студэнцкім асяроддзі, на першым месцы ўсё той-жа Піскун. Але гэтыя любімчыкі былі выкарыстаны Піскуном у бок разлажэньня некалькіх асоб і разврату. Палавой разбэшчанасьцю (пэдэрастыяй) Піскун займаўся і раней, але гэта ўдалося выявіць толькі цяпер. Перапіска і выпісваньне да сябе сваіх ахвяр—дзяцей з бруднай мётай—высьветлілася толькі цяпер.

Піскун імкнуўся, і яму гэта ўдавалася, адмяжоўваць сваіх любімцаў ад усяго студэнцкага асяроддзя. Меў на сваёй кватэры бедных студэнтаў, матар'яльна ім дапамагаў і вядзекаваўся. Абкружыў сябе цэлай групай студэнтаў і стрымліваў іх запужваньнем «нудамі» і пазбаўленьнем стыпэндыі.

Піскунізм.

Як бачым, яскравай ніткай праз усе хворыя зьявішчы ў галіне выхоўваньня праходзіць асоба Піскуна.

Нават усе падзеі ў тэхнікуме атрымалі сваю спэцыяльную назву «піскунізм».

Трэба сказаць, што і іншыя выкладчыкі тэхнікуму спусьціўшы рукавы глядзелі на праявы „піскунізму" і слаба рэагавалі на яго.

Нават лічылі, што ён—Піскун адзін з лепшых і шчырэйшых настаўнікаў, які вельмі чула рэагуе на ўсе пытаньні студэнцкага жыцьця—ну проста «благадзецель».

Настаўніцкі склад.

Па сацыяльным паходжаньні настаў

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў БССР

па дакладу аб дзейнасьці Белдзяржстраху

Выслухаўшы даклад аб дзейнасьці Белдзяржстраху, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Адзначыць, што дзяржаўнае страхаваньне ў БССР набыло вялікае гаспадарчае значэньне, з прычыны ўвязкі яго з агульна-эканамічнымі мерапрыёмствамі савецкай улады і з правядзеньнем клясавай лініі ў адносінах асобных груп насельніцтва.

2. Канстатаваць, што органамі Белдзяржстраху на працягу 1927-28 г.:

а) ахоплены страхаваньнем пасьля ўвядзеньня абавязковага страхаваньня коняй у 7 округах усе галоўныя галіны сельскае гаспадаркі БССР;

б) значна пашыраны агульныя апэрацыі ў параўнаньні з мінулым годам (па страхавой суме на 26,3 проц. і па суме сабраных страхавых плацяжоў на 37,2 проц.).

в) зьніжаны накладныя выдаткі да 13,48 проц. супроць 19,30 проц. у 1926-27 г.;

г) праведзены цесны кантакт у страхавой працы з мясцовымі выканаўчымі камітэтамі.

3. Для далейшага разьвіцьця і палепшаньня дзяржаўнага страхаваньня ў адпаведнасьці з агульна-дзяржаўнымі задачамі:

а) прызнаць патрэбным увядзеньне абавязковага страхаваньня маемасьці аграмаднаго сэктару на пачатках максымальнага спрашчэньня і патаньненьня вядзеньня страхавой справы,—паставіць гэтае пытаньне на вырашэньне Савету Народных Камісараў СССР. Да вырашэньня гэтага пытаньня запрапанаваць адпаведным установам і арганізацыям БССР дакладна выконваць пастанову СНК БССР за 2 красавіка 1928 году «Пра страхаваньне дзяржаўнай і грамадзкай маемасьці» (З. З. БССР 1928 г. № 15, арт. 126);

б) даручыць НК РСІ БССР распрацаваць пытаньне аб абавязковым вядзеньні ўстановамі і прадпрыемствамі дакладных інвэнтароў маемасьці, якая патрэбна ня толькі для страхаваньня, але і для агульных мэт плянавага вядзеньня гаспадаркі;

в) ухваляючы ўзяты Белдзяржстрахам напрамак на пашыраньне відаў адказнасьці па абавязковаму акладному страхаваньню маемасьці прыватнага сэктару, а таксама і па павялічэньню разьмераў страхавых сум з адначасовым павялічэньнем льгот для беднаты ў сельскіх мясцовасьцях, запрапанаваць кіраўніцтву Белдзяржстраху ўжыць захады для пашырэньня апэрацый па дабраволнаму страхаваньню хатняй маемасьці і сельска-гаспадарчага інвэнтару, а таксама па звыш-акладному страхаваньню рагатай жывёлы і коняй ад падзяжу і сельска-гаспадарчых культур ад градабіцьця;

г) узмацненьне ў агульна-дзяржаўны абарот прыватных грашовых сум праз асабовае страхаваньне, высоўвае апошняе на адно з відных месц сярод іншых відаў дзяржаўнага страхаваньня, для чаго лічыць патрэбным узмацніць увагу мясцовых савецкіх органаў і грамадзкіх арганізацый на разьвіцьцё асабовага страхаваньня і ўтварыць грамадзкую зацікаўленасьць да гэтай галіны.

4. Бяручы пад увагу, што колькасьць выпадкаў гарымасьці ў БССР выклікае патрэбнасьць у шырокіх супрацьпажарных мерапрыемствах, якія ня могуць быць заданоўлены толькі адлічэньнямі ад сродкаў Дзяржстраху:

а) вынарнуць увагу акруговых выканаўчых камітэтаў на недапусьцімасьць вымяншэньня асигнаваньняў на пажарную ахову па мясцовому бюджэту пад уплывам адлічэньняў на гэтыя-ж мэты з акладу дзяржаўнага страхаваньня;

б) даручыць органам Народнага Камісарыяту Земляробства паглыбіць мерапрыёмствы для разьвіцьця сельскага агнятрывалага будаўніцтва праз падрыхтоўку насельніцтва, арганізацыю таварыстваў агнятрывалага будаўніцтва, павялічэньне вырабу матар'ялаў для агнятрывалага будаўніцтва і забесьпячэньне сялянства гэтым матар'ялам, а таксама прыладамі, якія вырабляюць такі матар'ял; узмацніць працу па распляніраваньню сяленьняў пасьля пажару;

в) запрапанаваць Народным Камісарыятам Унутраных Спраў і Земляробства, а таксама акруговым выканаўчым камітэтам выдаткоўваць сродкі па простаму іх прызначэньню і прыняць захады для паданьня Кіраўніцтву Белдзяржстраху на працягу аднаго месяца справаздачнасьці аб скарыстаньні імі ў 1927-28 годзе сродкаў Дзяржстраху на меры прэвэнцыі і рэпрэсіі.

V. Для пасьпяховага змаганьня з сельскімі пажарамі даручыць:

а) акруговым выканаўчым камітэтам пераглядзець існуючыя абавязковыя пастановы па пажарнай ахове ў сельскіх мясцовасьцях у бок узмацненьня рэпрэсій за парушэньні процівапажарных правіл, узмацніць мерапрыёмствы змаганьня з п'янствам і самагонакурэньнем;

б) райённым выканаўчым камітэтам выдаць абавязковыя пастановы аб мерах прадасьцярожнасьці ад пажараў і змаганьня з імі;

в) райённым выканаўчым камітэтам і сельскім саветам узмацніць нагляд за выкананьнем насельніцтвам правіл забудоўкі і процівапажарных правіл.

VI. Бяручы пад увагу, што рост наўмысных падпалаў стварае вялікую пагрозу сельскай гаспадарцы Рэспублікі, запрапанаваць Кіраўніцтву Белдзяржстраху, акруговым выканаўчым камітэтам і райённым выканаўчым камітэтам завастрыць грамадзкую ўвагу на змаганьне з гэтым зьявішчам і мабілізаваць у бліжэйшы час дзяржаўныя і грамадзкія сілы на ліквідацыю сельскіх падпалаў. У паасобку:

а) органам міліцыі і крымінальнага вышуку ўзмацніць і палепшыць якасьць работы па высьвятленьню прычын пажараў і выкрыцьцю падпалаў;

б) Народнаму Камісарыяту Юстыцыі зрабіць захады да строгага ўжываньня інструкцыі судова-сьледчымі органамі па расьсьледаваньню падпалаў і пакараньню падпальшчыкаў.

VII. Запрапанаваць Кіраўніцтву Белдзяржстраху і ў далейшым імкнуцца да своечаснай і правільнай ліквідацыі страхавых страт, зьвяртаючы пры гэтым асаблівую ўвагу на своечасную выплату страхавой узнагароды за паўшую жывёлу.

VIII. Маючы на ўвазе, што збор плацяжоў па абавязковаму акладному страхаваньню за 1928-29 г. павінен быў закончыцца да 1-га лютага г. г. і што на гэты дзень паступіла акладных страхавых плацяжоў (разам з недоімкай за мінулыя гады) па сельскаму страхаваньню 81,5 проц., а па гарадзкому 89,3 проц.,—лічыць такія вынікі незадавальняючымі і запрапанаваць акруговым і райённым выканаўчым камітэтам, а таксама органам Дзяржстраху прыняць усе захады да таго, каб збор страхавых плацяжоў закончыць не пазьней 15 красавіка г. г.

IX. Лічыць недапушчальнымі меўшыя месца ў некаторых выпадках затрыманьні райённымі выканаўчымі камітэтамі ў сваіх касах сабраных страхавых плацяжоў і запрапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам самымі рашучымі захадамі паперадзіць і ліквідаваць у будучым такія зьявішчы.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР А. Дубавіцкі.

25 сакавіка 1929 г.
г. Менск.

ПРА АДЗІН ХАРАКТАР.

27 сакавіка нашы цэнтральныя газэты адзначылі вечар, прысьвечаны літаратурнай і тэатральнай дзейнасьці народнага артыста Галубка. Грамадзкасьць ня бачыла ўдзелу ў гэтым вечары БДТ1, а таксама і саюзу працаўн. мастацтва. Наколькі нам вядома, тэатр на гэта зьявішча дае простае тлумачэньне:—нас не запрасілі, і таму мы «не смели» ўвайсьці ў тэатр. Нам думаецца, што трудна будзе дырэкцыі тэатру і асабліва мясцкому адмовіць таго факту, што члены полымскае камісіі зварачаліся да іх і прасілі прыняць удзел. Нават запрашалі дапамагчы ў канцэрце, на што мясцком даў сваю згоду і абяцаньне прыняць удзел.

Аднак, у апошнія перад вечарам гадзіны ў мясцкоме адбылася нейкая нарада, на якой і вырашана было: на вечар не хадзіць і нікому ў канцэрце не выступаць.

У чым-жа справа? Аказваецца, што тро'было пасласць усім персанальныя запрашэньні з абавязковым прадастаўленьнем месц у партэры, тады-б яны прышлі на гэты вечар і зрабілі-б «любезность» Галубку — прывіталі-б яго.

Цікава, што перш, чым выносіць такую „стачачную" пастанову, ніхто з іх не пажадаў сустрэцца з камісіяй, каб хоць сказаць пару «балючых» слоў. Яны адразу пачынаюць некаму помсьціць. «В концерте не участвуем»!

Аднак, таварышы з БДТ1 ніяк не маглі адмовіцца ад сваіх законных праў—уваходу ў тэатр Яны (можа ня ўсе) прышлі ў будынак тэатру. Сядзелі ў сваім ленкутку, буфэце, хадзілі па калідоры, бывалі за кулісамі, а т. Сэлях нават выступіў у канцэрце—грамадзтва вітала яго апладысмэнтамі, а ўсё-ж сказаць пару слоў яны не пажадалі.

Не дазволіў характар. Яны ідуць на пошту і «б'ют» Галубку прывітальную тэлеграму, што вітаем цябе, што асабіста вітаць ня можам, бо нас не запрасілі. Выходзіць, што Галубок павінен быў спэцыяльна прасіць іх прыйсьці і прывітаць яго. «Выполнивши долг вежливости», яны спакойна, начале з мясцкомам, прыемна праводзяць час у сваёй установе—у тэатры.

Больш цікавай з большым характарам зьяўляецца «мадам» з ЦП саюзу прац. мастацтва т. Панава. Знаходзячыся ў тэатры на спэцыяльным крэсьле 5 раду № 20, яна не магла сказаць 5-10 прывітальных слоў, бо за адзін дзень яна не магла падрыхтавацца (яе словы В. Б.). Здаецца, тут усё ясна.

Прынамсі, характар БДТ1 зьяўляецца характэрным у адносінах да Галубка і БДВТ. Бо сапраўды, калі-б дапусьціць, што камісія і зрабіла якую намыўку, прычым-жа тут Галубок. А гісторыя з тэлеграмкаю—гэта-ж такі перл, да якога рэдка хто можа дадумацца.

Гэта ня тое, што скажам напісаць ліст і ў канцэрце перадаць гэта не эфэктна, а вось дэпеша «это уж будьте уважаемы»...

Васіль Базылёвых.

З ЛІСТОЎ РАБСЕЛЬКОРАЎ.

ЛЕС ТОЛЬКІ ЗАМОЖНІКАМ.

Гр-не вёскі Барысаўшчыны, Жаўлянецкага сельсавету, Глускага раёну, маюць вучастак лесу мясцовага значэньня. Кожны год пры разьмеркаваньні гэтага лесу адбываюцца бойкі, бо сельсавет разьмеркаваньнем не займаецца, а яго «разьмяркоўвае» сабе той, хто мацней. У выніку—беднота ніколі не насьпявае вывезьці сабе лесу.

Глускі РВК, зьвярні ўвагу.

В. Мішур.

НЕ СКАРЫСТОЎВАЮЦЬ ПОПЕЛУ.

Пухавіцкі РВК зрабіў «усё магчымае» для збору попелу: даў дырэктыву, паслаў абежнік і г. д. Але запаматаў адну рэч—арганізаваць збор попелу ў сваёй установе. У памяшканьнях РВК ёсьць 6 печаў і ў нардоме 2. З гэтых печаў можна за зіму сабраць многа попелу, але чамусьці яго высыпаюць ка вуліцу.

А.

ІСКУЕ НА ПАПЕРЫ.

Яшче ў 1926 г. у вёсны Чэбатовічы арганізаваны селькораўскі гурток. Гурток мае 3-хгадовы стаж існаваньня, але існаваньня на паперы. За 3 гады ня было ніводнага сходу гуртка, і ніхто не пакланаціўся нават растлумачыць селькорам аб задачах гуртка.

Чэбатовіцкай ячэйцы КП(б)Б неабходна ўзяцца за наладжаньне працы гуртка.

Я. Карлоўскі.

КСУ РАЗВАРУШЫЎСЯ.

Камісія па падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы разварушыла і в. Крушынаўскі камітэт сялянскай узаемадапамогі. Камітэт правёў нараг сходаў сялян, на якіх разьбіралі абежнік ЦК КСУ аб плацельшчыках і аб вясеньняй сяўбе. Камітэт арганізаваў пракатны пункт па ачыстцы збожжа. Зараз камітэт узяўся за ачыстку збожжа з платай ад беднаты па 10 кап. з двара і ад серадняцтва—5 проц. з сумы сельска-гаспадарчага падатку.

Я. Крушына.

ЛІЧБЫ СА СТОЛІ.

Бярэзінскі раён КСУ вельмі «добра» кіруе сельскімі КСУ і добра «ведае» аб іх становішчы. Атрымаў старшыня РайКСУ т. Шукан адносіну з АкрКСУ аб падрыхтоўцы справаздачы і прыезьдзе на акруговую нараду ў Менск. Забегаў т. Шукан, але ўспомніў пагаворку—«ня плюй на столь, бо там лічбы ёсьць»—і вось ён са столі сабраў лічбы аб ачыстцы насеньня і паехаў на нараду.

Зоркі.

АЎСОМ БУДЗЕМ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ.

(Рагачэўскі раён).

Гэтымі днямі прыбыло 10 ваговаў аўсу, які закупілі крэдытныя таварыствы для здавальненьня сялянства. Аўёс двух гатункаў, завезен з Вяцкай губ.

Ёсьць надзея, што попыт сялянства будзе забясьпечан поўнасьцю.

Я.

МАЛЕЛЬНІ — ПАДКУЛЬТУРНЫЯ ЎСТАНОВЫ.

Каталіцкі вялікадзень працоўныя палякі Менску адзначылі вялікай антырэлігійнай дэманстрацыяй.

У гэтай дэманстрацыі вельмі каштоўна тое, што яна арганізавалася па ініцыятыве нізавых ячэек саюзу «Бязбожнік».

Прыемна было бачыць, як з усіх куткоў Менску арганізаванымі шэрагамі рухаліся на Пляц Волі працоўныя фабрык і заводаў, працоўныя іншых прадпрыёмстваў і ўстаноў.

Цэлае мора плякатаў... Плякаты і сьцягі без канца. Што ні плякат—то баявы лёзунг, заклікаючы да барацьбы са спадчынай царскага ладу—з рэлігійным дурманам.

Пераважная большасьць дэманстрантаў—палякі, але ў шэрагах іх можна было бачыць беларусаў, яўрэяў і іншыя нацыянальнасьці. Аб гэтым лепш за ўсё сьведчылі лёзунгі на ўсіх дзяржаўных мовах нашай Савецкай Беларусі.

— „Касьцёлы, цэрквы і сынагогі—пад культасьветныя ўстановы"...

— „Ніводнага рэлігійнага дню бяз працы на прадпрыёмстве"...

— „Прэч рэлігію, як арудзьдзе панства"...

Цэлыя сотні лёзунгаў...

— Добрае кіно атрымаецца з гэтага касьцёлу,—кажа дарослы рабочы свайму суседу, таксама дарослому рабочаму.

— Так, так... А вось з гэтай царквы выйдзе ня горшы клюб...

— Вось рабочыя шаўцы ня так даўно атрымалі сынагогу на Ленінскай і зараз там працуюць,—кажа неікі хлапец.

— Ведаеце што, таварышы, трэба добра пакрыць наш Эльвод!..

— А што, пытаецца скураная куртка.

—Як што...Возьмем мы любую царкву, касьцёл, ці сын гогу, дык элекрычнае сьвятло разьліваецца цэлым морам, а на акраіны гораду сьвету не даюць...

— Правільна, правільна...— падтрымалі нашага агітатара шэраг дэманстрантаў.

* * *

На Пляцу Волі сабралася некалькі тысяч антырэлігійных дэманстрантаў. Куды ні кінеш вокам—усюды плякаты, лёзунгі, сьцягі, адзінадушны кліч якіх—даёш да ы рэлігійнага дурману для нашых клюбаў і культасьветных устаноў.

Пачынаецца мітынг...

Адзін за адным выступаюць рабочыя і работніцы.

— Досыць рэлігійнага дурману, ня верым мы ні ў багоў, ні ў чарцей. Мы верым толькі сваім рабочым рукам...

— Ксяндзы з амбону гавораць нам аб любві, прапаведуюць—ня «убій», а самі разам з фашыстамі ўсіх колераў рыхтуюць напад на нас, прагнуць заліць у крыві першую ў сьвеце рэспубліку рабочых і сялян. Прэч папоў і ксяндзоў, прэч рабінаў і іншых клерыкалаў,—гавораць з уздымам работніца.

Гучныя воплескі шматтысячнай масы былі добрым адказам усім прамоўцам, заклікаўшым на барацьбу з рэлігіяй, на барацьбу з клерыкаламі і патрабаваўшым перадачы касьцёлаў, цэркваў і сынагог пад дамы культуры.

— Тысячы рук падняліся за тое, каб прасіць урад аб перадачы касьцёлаў пад культурныя патрэбы працоўных.

Мітынг скончаны... Аркестры музыкі зайгралі вясёлыя маршы; антырэлігійная дэманстрацыя пачала разыходзіцца арганізаванымі шэрагмі ў розныя канцы гораду.

ХРОНІКА.

Лепшае адзеньне—лепшыя тавары.

У надзелю, 31 сакавіка, наапэрацыйны актыў г. Менску з прадстаўнікоў рабочых прадпрыёмстваў, арграндзю, рэвакамісіі і гуртноў зрабілі лятучую праверку вагі і цэн у крамах МЦРК.

Усе 31 чалавек наапэрацыйнага актыву з кошыкамі ў руках паразыходзіліся па розных крамах пад выглядам звычайных пакупцоў. Усе закупленыя тавары былі пасьля пераважаны, прычым гэты наёт вынёс наступнае.

У 57-ю мясную краму ўперад займела чыста ўбраная прапаўніца Белсельсаюзу якой далі добрае тлустае мяса. Услед за ею праз 20 хвілін брала мяса работніца „Чырвоны Золак", ня зусім «шляхэтна» апранутая. За тое яна атрымала мяса дрэннай якасьці з недахопам вагі.

У іншых мясных крамах, наадварот, была заўважана поўная вага ящчэ з гакам. У 15 краме на 20 гр. перку не хапіла 2 гр. У хлебных крамах заўважаны недахоп стандартнай вагі г. з., што хлебазавод выпускае хлеб меншай вагі. Наадварот, у 86-й краме чай прадаваўся вышэй нармальнай вагі.

Камісія выявіла, што амель ва ўсіх касах МЦРК чамусьці не даюць рэшты поўнапенькі. За дзень у касах зьбіраецца даволі шмат гэтых грошыкаў.

Камандыроўкі рабочых у вёскі павінны быць аплочаны.

У свой час ЦВК СССР і БССР былі дадзены дырэктывы аб аплаце рабочых, якія выяжджалі ў вёскі для ўдзелу ў кампаніі перавыбараў саветаў.

Ня гледзячы на дырэктывы, вёсьць выпадкі, што да гэтага часу рабочым не аплацілі дзён, якія яны прабылі ў вёсцы ў часе кампаніі.

Акрывыканкомам загадана тэрмінова вытварыць разьлік з рабочымі па гаспадарчай лініі.

Побач з гэтым даручана высьветліць прычыны, чаму так доўга на мясцох не аплачвалі рабочых за час знаходжаньня ў вёсцы. Вінаватых у гэтым будуць прыцягнуты да адказнасьці.

Паўтара міл. рублёў — на сельска-гасп. машыны.

Белсельбанк адпусьціў акрсельбанкам крэдыт у сум[illegible] 500 тысяч рублёў на набыцьцё сельска-гаспадарчых машын.

Транспартнікі на дапамогу пасеўнай кампаніі.

Саюз транспартнікаў выдзеліў 2 рабочых брыгады для паездкі ў падшэфныя вёскі для рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару.

Адна брыгада выяжджае ў Крупскі сельсавет, а другая ў в. Строчына, Самахвалавіцкага раёну. Рабочыя брыгады забясьпечаны 5-ю бібліятэчкамі сельска-гаспадарчай літаратуры. ЦП саюзу на паездку рабочых брыгад адпусьціла з культфонду 100 руб.

Усебеларуская культнарада.

Культадзел ЦЕСПС у бліжэйшым часе мяркуе склікаць усебеларускую культнараду. На гэту нараду прыедуць прадстаўнікі з усіх округ, а таксама прымуць удзел прадстаўнікі культадзелаў ЦП саюзаў, прапаўнікі менскіх фабрык, заводаў і клюбаў.

Нарада абгаворыць вынікі зімовай культпрацы і вызначыць шляхі яе на летні перыяд.

Вывучэньне гісторыі асьветы ў Беларусі.

Пры гістарычнай клясе Беларускай Акадэміі Навук існуе камісія [illegible] гісторыі асьветы Беларусі, якая мае мэтаю ўсебаковае вывучэньне гісторыі асьветы Беларусі, у сувязі з сучасным становішчам школы. Праца камісіі павінна зацікаўленасьць шырокіх колаў нашай грамадзкасьці, асабліва настаўніцтва.

Наступны сход камісіі адбудзецца 4-га красавіка а 7-ай гадзіне ўвечары ў памяшканьні БАН (Ленінскай 21, II паверх), на [illegible] І. І. Краскоўскі зробіць даклад на тэму: „Арганізацыя Інстытуту Навуковай Педагогікі пры Другім Маскоўскім Універсытэце.

На пасяджаньні камісіі запрашаюцца навуковыя працаўнікі і настаўніцтва, ад якіх будуць прымацца заявы аб залічэньні іх у лік супрацоўнікаў камісіі.

Гутарка П. Маркава з менскімі журналістамі.

Сёньня а 8-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні кутка працаўнікоў друку маскоўскі тэатральны крытык П. Маркаў правядзе гутарку з менскімі журналістамі на тэму аб тэатральнай рэцэнзіі і задачах савецкага рэцэнзэнта.

На гутарку запрашаюцца таксама і менскія рабкоры.

Тав. Хацкевіч вярнуўся з камандыроўкі.

Гэтымі днямі вярнуўся з камандыроўкі на Каўказ сэкратар ЦВК БССР т. Хацкевіч.

У МЕНСКАЙ АКРУЗЕ АЧЫШЧАНА 70 % НАСЕНЬНЯ.

Па няпоўных весткаx, у 9-ці райённых Менскай акругі да гэтага часу ачышчана ўжо каля 70 проц. насеньня: Барысаўскі райён ачысьціў 65 проц, Бягомльскі 70 проц, Грэскі—80 проц. Заслаўскі—68,3 проц., Капыльскі—58 проц., Лагойскі—49,1 проц., Пухавіцкі—78,7 пр., Смалявіцкі—120 проц., Сьмілавіцкі—60 пр.

163.000 руб. на барацьбу з пажарамі.

У 1927-28 годзе Дзяржмотрах адпусьціў на мерапрыёмствы па барацьбе з пажарамі для сельскіх мясцовасьцей 64556 р. і для гарадоў 40269 руб. Апрача таго, было адпушчана на агнятрывалае будаўніцтва і іншыя паказальныя мерапрыёмствы ў сельскіх мясцовасьцях 59000 руб.

Культурныя навіны.

Беларускае мастацтва на выстаўцы ў Лос-Анджэлосе.

На выстаўцы міжнароднага т-ва кніжнага знаку ў Лос-Анджэлосе (Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты) у маі 1928 г. ад БССР удзельнічалі мастацкія працы Е. С. Мініна з кніжнымі знакамі, А. А. Шлюбскага, Б. М. Гурэвіча і 8 знакаў С. Б. Юдовіна, з якіх 3 належаць вядомаму мастаку-аўтару Фурману. Юдовіч за свае знакі атрымаў гапароны водзыў-дыплём. Гравюры Мініна «Стары Віцебск», вымашчаныя ў выданьні «Віцебскія мастакі», надрукаваны ў лёндонскім ангельскім штогодніку. 23 гравюры на дрэве Юдовіна ў лютым 1929 г. удзельнічалі на выстаўцы ў Нью-Ёрку.

На чарговай выстаўцы ў маі 1929 г. міжнароднага т-ва кніжнага знаку ў Лос-Анджэлосе ўдзельнічаюць працы наступных віцебскіх мастакоў: 1) Е. С. Мініна з кніжнымі знакамі Мініна, Касьняровіча і Фурмана і 2) Л. М. Леймтан з знакамі Фурмана.

На выстаўцы Асацыяцыі Рэвалюцыйных Мастакоў Украіна таксама дэманстраваліся экспанаты некаторых беларускіх мастакоў. На гэтай выстаўцы музэй кіеўскага мастацкага універсытэту набыў усе гравюры Е. С. Мініна.

Цікавая знаходка беларускіх грыўнаў.

Беларускі Дзяржаўны Музэй набыў 4 вельмі рэдкія грыўны 10-11 ст. Ня грыўных выбіты славянскі арнамэнт. Грыўны знойдзены ў м. Старобіне.

Паэма «Тарас на парнасе» была напісана ў Віцебшчыне.

Тав. Васілеўскі надаслаў у ЦБ Краязнаўства дасьлед на тэму: «Тарас на парнасе ў краязнаўчым асьвятленьні», дзе ён даводзіць шляхам аналізу слоўнага матар'ялу паэмы „Тарас на парнасе» і слоўніку Віцебшчыны, што твор гэты напісаны Арцёмам Вярыга-Дарэўскім у Віцебшчыне.

БІБЛІАГРАФІЯ.

П. ЗАЯЦ. АЧЫШЧАНАЕ НАСЕНЬНЕ ПАВЯЛІЧВАЕ ЎРАДЖАЙНАСЬЦЬ. Кн. № 99, з цыклю «Сялянская бібліотэка». Белдзяржвыдавецтва. Менск — 1929. Стар. 32, цана 10 кап.

Белдзяржвыдавецтва выконвае цяпер ударную задачу па выданьні спэцыяльнай літаратуры, якая мае сваёю мэтай уздым ураджайнасьці сельскай гаспадаркі. Няма чаго і гаварыць, што ў такой літаратуры адчуваецца вялікая патрэба. Сялянства наша само бачыць, што гаспадарка яго—пры першабытных способах яе вядзеньня—дае вельмі малую карысьць, але ня ведае, як зрабіць, каб гэтая карысьць была большай. Савецкая ўлада робіць вялізныя высілкі, каб падняць ураджайнасьць сялянскай гаспадаркі і наогул падняць сялянскі дабрабыт. У вёску кінуты розныя сельска-гаспадарчыя машыны: па апрапоўны зямлі трактары, палепшаныя плугі і бароны і г. д., па магчымасьці ўводзіцца штучнае ўгнаеньне, праводзіцца энэргічная кампанія па ачыстцы насеньня.

Памянёная кніжка гр. П. Зайца мае сваёю мэтаю даказаць, што ачыстка насеньня мае вялікі ўплыў па павялічэньне ўраджайнасьці. З кніжкі мы даведваемся, што адзін пуд неачышчанага верна мае 2—2,4 кілгр. (5—6 фун.) насеньня пустазельля, 2,4—2,8 (6—7 фун.) зернят бітых і недасьпелых, 10,8—11,2 кілгр. (27—29 фун.) добрага насеньня.

Дзякуючы такому складу насеньня, нашы палі засьмечаны пустазельлем, ямагацца з якім вельмі цяжка, бо пустазельле можа ляжаць у глебе 8—10 гадоў і потым усходзіць. Апрача таго, пустазельле дае шмат насеньня. Напрыклад, адно каліва палявой гарчыцы дае за лета 3 тысячы зернят; асот—каля 20—30 тыс. зернят, куколь—тысячу, валошка—6 тысяч, лебяда—3 тысячы. Такім чынам, пустазельле разводзіцца вельмі шпарка і часамі зусім глушыць засевы. А між тым, ня гледзячы на тое, што машын-сартыровак ня кулена ў нас даволі многа, ваш селянін ачышчае ад пустазельля толькі чацьвертую частку насеньня ярыны і дзесятую частку азімыны.

Калі ўзяць толькі 10 проц. прыросту да ўраджаю ад ачышчэньня насеньня, дык згодна з вылічэньнямі гр. П. Зайца, мы мелі-б у 1928 г. збожжа на 1.506.200 цэнтнэраў (8 міліёнаў) пудоў больш.

Статыстычнымі табліцамі т. Заяц паказвае вялікую шкоднасьць для ўраджайнасьці засьмечанасьці насеньня і палёў, пасьля чаго пераходзіць да разгляду пытаньняў: калі лепш ачышчаць насеньне, якія існуюць машыны для ачышчэньня насеньня (арфы, сартыроўкі «Трыумф», трыеры, сартыроўка - вымейка, сартыроўка-ільватрашчотка, сартыроўка «Кускута»), аб доглядзе за машынамі, што ачышчаюць зерня, аб тым, якое зерня і на якіх машынах трэба чысьціць, дзе можна ачысьціць насеньне, дзе можна купіць машыны для ачысткі насеньня, і што кажуць сяляне пра ачышчэньне насеньня.

Ня можна не згадзіцца з т. Зайцам, што ачыстка насеньня мае ў нас такое вялікае значэньне ў справе павялічэньня ўраджайнасьці, што ўрадам БССР прыняты меры, каб на працягу 3-х гадоў усё насеньне высяванае сялянствам, ачышчалася перад пасевам. Маецца нават за ўвазе выдаць закон, на падставе якога ўсё насеньне ў абавязковым парадку павінна будзе ачышчаць насеньне.

П. Т.

«ПРАГРАМА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАГА ГУРТКА ПА САМАДУКАЦЫІ», апрацаваная навукова-мэтадалёгічным камітэтам Народнага Камісарыяту Асьветы БССР. Белдзяржвыдавецтва. Менск 1929 г. Стар. 48. Цана 20 кап.

Навукова-мэтадалёгічны камітэт камісарыяту асьветы БССР выпусьціў ужо другое выданьне „праграмы для сельска-гаспадарчых гурткоў па самаадукацыі для шырокіх мас насельніцтва. Другое выданьне праграмы мае шырэйшы вымест, бо выявілася, што гурткі з больш падрыхтаванымі членамі патрабуюць шырэйшай праграмы, па якой можна было-б прапрацоўваць пытаньні сельскай гаспадаркі больш стала і грунтоўна. Другое выданьне прадугледжвае ўжо папярэднюю падрыхтоўку членаў на ніжэй чатырох клясаў сямігодкі. Зьмест тэм складзены ў новай праграме так, што пастаўленае пытаньне павінна быць прапрацавана больш грунтоўна, чым у праграме элементарнай.

Усіх тэм для прапрацоўкі ў праграме вызначана дваццаць пяць: 1—уступная; 2-11—паліводства (дзесяць); 12-16—жывёлагадоўля (пяць); 17-20—дапаможныя тэмы—дробныя галіны сельскай гаспадаркі (чатыры) і 21-25—арганізацыйныя пытаньні сельскай гаспадаркі (пяць).

Асобныя тэмы праграмы пабудаваны так, што кожная з іх зьяўляецца заканчэньнем пытаньнем і можа быць прапрацована паасобку. Але паміж імі існуе ўнутраная сувязь, якая праходзіць праз усю праграму і робіць яе адным цэлым. Таму можна прапрацаваць ня ўсе тэмы, а тыя, якія больш цікавяць членаў гуртка.

Пытаньні ў тэмах пастаўлены так, каб ад найбольш простага пераходзіць да больш складанага. Напрыклад, яны пачынаюцца вывучэньнем становішча нашай сельскай гаспадаркі і яе недахопаў, потым ідзе азнаямленьне з тэхнічнымі прыёмамі гаспадараньня і, нарэшце, праграма даходзіць да галоўнай мэты—увядзеньня шматпольля і арганізацыі калектыву. Праз усю праграму праходзіць думка канечнай патрэбы кааперараньня і калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Абгаворваньне ў калгасы ставіцца канчатковай мэтай, да якой павінна дайсьці сялянская гаспадарка.

Выданьне пашыранай праграмы сельска-гаспадарчых гурткоў сьведчыць як аб вялікай увазе Савецкай улады да падняцьня вытворчых сіл сельскай гаспадаркі, так і аб росьце зацікаўленасьці гэтым пытаньнем з боку самога сялянства. Можна быць упэўненым, што другое пашыранае выданьне праграмы сельска-гаспадарчых гурткоў значна палегчыць працу гэтых гурткоў па падняцьні культуры сельскай гаспадаркі.

Цана кніжкі-праграмы-20 кап. — даступная ўсякаму. Астаецца толькі пажадаць, каб бю зацікавіліся шырокія сялянскія масы.

Н.

АДКАЗЫ КАРЭСПАНДЭНТАМ.

Аўтару допісу—«Белдзяржкіно адгукніся». На ваш допіс Белдзяржкіно паведаміла наступнае: „Кіно-перасоўка не працавала секторы, час з прычыны звычайнага рамонту, пішкі [illegible] ад машыны [illegible] не паёв, карціны дасылаюцца ідэалёгічна-вытрыманыя. Зараз кіно-перасоўкі перайшлі ў веданьне Белкаапсаюзу.

Аршанку Я. і Актывісту: Допісы—«Гандлар», „Галавацінства" і „Бабнік" ня пойдуць.

Т. Кіму:—Ваш артыкул „Вялікія, маленькія і маленечкія"—накіраваны ў ЦКК РСІ на расьследаваньне.

Лавоніку: На допіс—«Закон ці беззаконьне» Дудзінае спажывецкае таварыства паведамляе, што настаўнікі, якія ня маюць свайго хлеба, атрымліваюць па 12 кілёграмаў мукі ў месяц на едака.

Х. Заку, Станкевічу і Висковаму: Допісы—«Нядбайна абапяцінца», «Падрыхтоўка разгарнулася» і «Рыхтуемся»—ня пойдуць за спазьненьнем.

Назіраючаму, Лясному, Міхальцову Станкевічу: Допісы — «Барысбюракратыя», „Неабходна абараніць доктара", „Як Полацкі райён" і «Працуюць бездакладна»—друкавацца ня будуць, бо аб гэтым ужо было.

Што слухаць па радыё.

АЎТОРАК, 2 КРАСАВІКА.

17-40—II-я гутарка з сялянамі з цыклю: «За ўраджай». Роля саўгасу, як базы па вырашэньню гатункавага насеньня і племянной жывёлы.
18-15—Музычны адпачынак.
18-55—Даклад т. Слоніма аб выніках рашэньняў XII зьезду КПБ па культурнаму будаўніцтву.
19-25—Беларуская радыёгазэта.
20-10—Радыёаматар на радыё в адказамі на тэх. запытаньні, і старонка—нашы радыёаматары.
21-00—Канцэрт, прысьвечаны творчасьці Шуберта (удзельнічаюць: Вастокаў, Баначыч і аркестр).
23-00—Агляд заўтрашняй прэсы.
23-20—Урок на вывучэньні азбукі «Морзэ».

СЕРАДА, 3 КРАСАВІКА.

17-40—Гутарка з настаўнікамі і хатнікамі, аб выніках 7-га ўсесаюзнага зьезду саюзу працаўнікоў асьветы.
18-05—Гутарка ўрача: „Всканыя хваробы і як ад іх абераргчыся"—ДСА.
18-25—Радыёгазэта для сельгаспрабочых «Беларускі Батрак».
19-05—Даклад камсамолу: „Аб выніках рашэньняў пленуму ЦК УсеЛКСМ».
19-25—Беларуская радыёгазэта.
20-10—Музычны адпачынак.
20-30—Лекцыя Рабоча-Сялянскага радыёуніверсытэту (на трых. курсу) на паліт. прадметах
21-15—Зьмешаны канцэрт у праграме: Р. Корсакаў, Грачанінаў, Бізэ, Ліст і г. д. (Вык. аркестр, Чавычаў і Васільчэнка).
23-20—Агляд заўтрашняй прэсы.

Апавяшчэньні.

ПЛЯН РАБОТЫ

ЛІТАРАТУРНАЙ СЭКЦЫІ БЕЛАРУСКАГА НАВ. МАРКСІЦКАГА Т-ВА.

1. 31 красавіка даклад: «Літаратурныя досьледы праф. Барычэўскага»—даклаўчык т. Бухарын.

Уваход для членаў т-ва і членаў дому пісьменьнікаў.

2. 17 красавіка даклад «Зямля» К. Чорнага—дакладчык тав. Мурашка. Уваход вольны.

3. 24 красавіка даклад: «Беларуская крытыка»—дакладчык тав. Фохт. Уваход вольны.

Пачатак а 8 з пал. гадз. увечары ў памяшканьні дому пісьменьнікаў.

Старшыня праўленьня т-ва СЯНЬКЕВІЧ.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня, 2-IV, а 7 гадз. увечары адбудзецца зачынены сход яч